Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
23 КАСТРЫЧНІКА 2013 г. СЕРАДА № 200 (27565) Кошт 1600 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## У падарожжа з малымі дзецьмі: вялікі клопат ці вялікая радасць?

СТАР. 4

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай СНАПКОЎ, міністр эканомікі:**

***«Намінальная сярэднямесячная заработная плата беларусаў можа дасягнуць у наступным годзе $628 у эквіваленце. Для збалансаванасці ўнутранага развіцця і зніжэння інфляцыі тэмп росту рэальнай заработнай платы (104 %) не перавысіць тэмпу росту прадукцыйнасці працы па ВУП (106 %). Дарэчы, прагноз сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2014 год не забяспечвае дасягненне ўзрагу колькасных паказчыкаў пяцігодкі. Тым не менш, ён дазваляе выйсці на якасныя мэты развіцця (перш за ўсё рост даходаў насельніцтва) і такім чынам знаходзіцца ў рэчышчы патрабаванняў кіраўніка дзяржавы».***

### КОРАТКА

Сістэма Tax free запрацавала ў ГУМе. Права на вяртанне ПДВ пакупнікі атрымліваюць пры куплі на суму больш за Br800 тыс. Пры гэтым купля павінна быць зроблена на працягу аднаго працоўнага дня ў адной краме, якая ўдзельнічае ў праграме вяртання ПДВ. ПДВ не будуць вяртаць пры куплі тытунёвых вырабаў, алкаголю, дзіцячых тавараў, прадуктаў харчавання, аўтамабільнага паліва.

Вярхоўны суд адмяніў смяротны прысуд Гомельскага абласнога суда прызнанаму вінаватым у здзяйсненні жорсткага забойства студэнткі ў Гомелі. Крымінальная справа накіраваная на новы суды разгляд новым складам Гомельскага абласнога суда.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.10.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9150,00 | ■ |
| Еўра | 12510,00 | ■ |
| Рас. руб. | 286,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1118,58 | ▲ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 18° |
| Віцебск | + 7° |
| Гомель | + 8° |
| Гродна | + 16° |
| Магілёў | + 7° |
| Мінск | + 9° |

ISSN 1990 - 763X

## ПАЛЯЎНІЧАЯ ЮШКА



Члены Смалявіцкага раённага таварыства паляўнічых і рыбаловаў на адным з прывалаў пасля калектыўнага загоннага палявання.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Падрабязнасці

## ПРАЦОЎНЫЯ ПЕНСІІ ПАВЯЛІЧАЦЦА Ў СЯРЭДНІМ НА 5,3%

**З 1 лістапада будзе праведзена карэкціроўка сярэдняй заработнай платы ў рэспубліцы, прыменянай пры папярэднім пераразліку пенсій. Зарплата павялічыцца на 5,4%, і, адпаведна, будуць павышаны працоўныя пенсіі.**

**Мінімальныя і сацыяльныя пенсіі ў краіне пераглядаюцца штоквартальна. Чарговы пераразлік іх будзе таксама ў лістападзе.**

Сярэдняя заработная плата, якую прымянялі пры папярэднім пераразліку пенсій, была 4 481 800 рублёў. Гэты паказчык, праіндэксаваны на 5,4%, дасягне ўзроўню ў 4 723 900 рублёў. У выніку пераразліку з лістапада працоўныя пенсіі па ўзросце павялічацца, па ацэнцы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі, у сярэднім на 5,3%.

Папярэдняе павышэнне пенсій адбылося ў чэрвені гэтага года. Тады памер пенсій вырас на 10%. Нагадаем, што 1 верасня сярэдняя працоўная пенсія ў краіне была 2 182 782 рублі, мінімальная складала крыху больш за 1,5 мільёна рублёў.

З 1 лістапада сярэдняя працоўная пенсія па ўзросце складзе 2 295 000 рублёў. Павышэнне пенсій закране 2,4 млн чалавек.

**Святлана БУСЬКО.**

### «ПРАМАЯ ЛІНІЯ» З МІНІСТРАМ АБАРОНЫ

**25 кастрычніка** — «прамая лінія» з **міністрам абароны Рэспублікі Беларусь, генерал-лейтэнантам Юрыем Віктаравічам ЖАДОБІНЫМ**.

Задаць пытанне міністру абароны вы можаце ў гэты дзень **з 10 да 11 гадзін** па нумары

**(8 017) 297 29 20.**

■ Фінансавы выдатнік

## «ПАТЭЛЕФАНУЙЦЕ Ў СВОЙ БАНК — СЭКАНОМІЦЕ ЧАС...»

**Нагодай для сённяшняй публікацыі стаў званок нашай чытачкі, якая абмалявала наступную сітуацыю. Гадоў 5 таму яна аформіла картку на зарплату, але не звычайную, а з авердрафтам. Цяпер яна выйшла на пенсію, і тая картка ёй больш не патрэбна. Жанчына папыталася, што адбылося з гэтым авердрафтам, ці павінна яна яшчэ штосьці-небудзь банку, або з яе ўжо ўсё выплілі. Пра ўважлівасць пры чытанні дагавораў і авердрафт пагадзілася распавесці наш эксперт Алена ЛАГУНІНА, начальнік аддзела арганізацыі працы Разліковага цэнтра пластыкавых картак Беларусбанка.**




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

СТАР. 7

■ Святло ў акне

## ЯКОГА КОЛЕРУ ВОСЕНЬ ЖЫЦЦЯ?

**У Віцебскай вобласці навучыліся значна эканоміць бюджэтныя сродкі дзякуючы новым формам сацыяльнай працы з адзінокімі пенсіянерамі. Для састарэлых арганізуюць «дамы зімоўкі», аб іх клапоцяцца прыёмныя, гасцявыя, патранатныя сем'і. А можна пастаянна жыць і ў «дамах сумеснага пражывання». Карэспандэнт «Звязды» пабываў у Гарадоцкім раёне і паглядзеў, як жывуць бабулі і дзядулі ў дзяржаўнай установе.**

### Клапоціцца як пра родную

**Святлана ЗУЕВА, дырэктар тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Гарадоцкага раёна,** параіла абавязкова наведаць вёску Малое Лосвіда, дзе пра 77-гадовую Раісу Сямёнаўну Сідунову клапоціцца Аляксандр Андрэевіч Рыбакоў. Па спецыяльнасці ён токар сёмага разраду, займаецца пчалярствам. Калі б не мужчына, бабулю прыйшлося б «пасяліць» на медыка-сацыяльны ложак у Гарадоцкую цэнтральную раённую бальніцу. Вядома, пры яе жаданні. Але ж яна нікуды не хоча перасяляцца. Акрамя яе, у вёсцы жывуць двое раней судзімых, а ў цёплы час года — дачнікі. Вёсачка — на беразе знакамітага возера, але яна, можна сказаць, знікае.

СТАР. 3

## ТЭЛЕФОННАЯ РАЗМОВА ПРЭЗІДЭНТАЎ БЕЛАРУСІ І КАЗАХСТАНА

**Напярэдадні самітаў кіраўнікоў дзяржаў, якія пройдуць у Мінску 24-25 кастрычніка, па ініцыятыве казахстанскага боку адбылася тэлефонная размова паміж Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам, які старшынствуе ў СНД, і Прэзідэнтам Казахстана Нурсултанам Назарбаевым. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Абмеркаваны пытанні, унесеныя на разгляд Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД. Асноўны акцэнт у ходзе размовы быў зроблены на пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета. Бакі абмеркавалі свае пазіцыі па ўсіх пытаннях парадку дня.

Аляксандр Лукашэнка і Нурсултан Назарбаеў таксама абмяняліся думкамі па найбольш актуальных аспектах двухбаковых адносін.

## НАЗНАЧАНЫ НОВЫЯ КІРАЎНІКІ МЯСЦОВЫХ ВЫКАНКАМАЎ

**Прэзідэнт Беларусі 22 кастрычніка разгледзеў кадравыя пытанні. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

Аляксандр Лукашэнка даў згоду на назначэнне:

ТОКАРА Мікалая Васільевіча — намеснікам старшыні Брэсцкага аблвыканкама;

КАЛАНЧУКА Фёдара Фёдаравіча — старшынёй Жабінкаўскага райвыканкама;

ГРАМАКОЎСКАГА Юрыя Анатольевіча — старшынёй Баранавіцкага гарвыканкама;

ЗАЗУЛІ Аляксандра Іванавіча — старшынёй Кобрынскага райвыканкама;

СЕЛЬМАНОВІЧА Вячаслава Лукіча — старшынёй Ляхавіцкага райвыканкама;

МІКАЛУЦКАГА Аляксандра Віктаравіча — старшынёй Жыткавіцкага райвыканкама;

КАДАЦЕНКІ Мікалая Міхайлавіча — старшынёй Бялыніцкага райвыканкама;

МУРАЎЁВА Аляксандра Аляксандравіча — старшынёй Чэрыкаўскага райвыканкама;

ДУЦЬКО Анатоля Іванавіча — старшынёй Магілёўскага райвыканкама;

ШЧУПЛЯНКОВА Анатоля Леанідавіча — старшынёй Круглянскага райвыканкама;

САЛАДУХІ Віталя Аляксандравіча — генеральным дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Інтэграл» — кіруючая кампанія холдынга «Інтэграл».

Даючы згоду на назначэнне кіраўнікоў мясцовых выканаўчых органаў, Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў, што яны фактычна будуць на пярэднім краі ў рабоце з людзьмі: «Вас бачаць усе, нават часам калі вам гэтага не хацелася б. Таму многае залежыць ад вашай сумленнасці, чысціні і ад той справядлівай палітыкі, якую вы будзеце праводзіць у сваім рэгіёне».

«У бліжэйшы час мы значна ўзмоцнім, адкрыта скажу, націск на адпаведныя кадры вашага ўзроўню ў плане адказнасці за развіццё малых гарадоў, раённых цэнтраў і асабліва сельскай гаспадаркі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Сёння ў вас усё ў руках для таго, каб зарабіць. Таму вы ўважліва пастаўцеся да гэтага», — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да кіраўнікоў мясцовай вертыкалі ўлады.

«Думайце аб тым, як будзеце жыць, забяспечваць той высокі ўзровень, які павінен быць у кожным раённым цэнтры. За гэта будзе вельмі строгае патрабаванне. Старшыні райвыканкамаў, кіраўнікі адміністрацый у гарадах не задзейнічаны па поўнай у вырашэнні сацыяльна-эканамічных і ідэалагічных праблем у краіне. Гэта маё цвёрдае перакананне. Вы павінны быць маторамі», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

## Аляксандр ЛУКАШЭНКА: «САМІТЫ Ў МІНСКУ ПРОЙДУЦЬ НА САМЫМ ВЫСОКІМ УЗРОЎНІ»

**Аб ходзе падрыхтоўкі да іх і іх правядзенні ішла размова 22 кастрычніка ў час сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і старшыні Выканаўчага камітэта — выканаўчага сакратара СНД Сяргея Лебедзева, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Сустрэча адбылася напярэдадні маючага адбыцца 25 кастрычніка ў Мінску пасяджэння Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД, якое Беларусь будзе праводзіць як старшынствуючая ў гэтым годзе ў Садружнасці. У цэнтры ўвагі былі пытанні падрыхтоўкі і правядзення гэтага важнага форуму.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што «Мінск з'яўляецца добрым месцам для правядзення перагавораў па паглыбленні інтэграцыі дзяржаў на постсавецкай прасторы». «І не толькі на постсавецкай. Думаю, настане той час, калі мы будзем весці дыялог аб інтэграцыі інтэграцый», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт растлумачыў, што мае на ўвазе Еўрапейскі саюз, дзяржавы АЦЭС, суседзяў на Усходзе, на Захадзе. «Я на гэта вельмі спадзяюся, і калі гэта здарыцца, то Мінск будзе такой жа цудоўнай пляцоўкай для вядзення такіх перагавораў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Сёння ў нас задача няпростая — праз пару дзён адбудзецца значнае мерапрыемства, пасяджэнне Савета кіраўнікоў дзяржаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў, а напярэдадні — эканамічны форум Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы, дзе будуць абмяркоўвацца прынцыповыя пытанні, — адзначыў Прэзідэнт. — Магчыма, гэта той шлях, па якім пойдуць і іншыя дзяржавы СНД. Прынамсі, мы прапануем гэта былым савецкім рэспублікам, асабліва Украіне. Ёсць жаданне ў Кыргызстана, Арменіі далучыцца да нашай «тройкі». Мы таксама будзем абмяркоўваць гэту праблему 24 кастрычніка».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што парадак дня вызначаны. Пры гэтым Прэзідэнт заўважыў: «Мы маглі б паставіць і больш сур'ёзныя пытанні, але мы не гарантуем, што знойдзем кансэнсус».

Цяпер зацвярджаюцца праекты дакументаў, якія потым будуць вынесены на разгляд кіраўнікоў дзяржаў.

«Вы бачыце, якая вялікая работа за апошні год была праведзена, каб належным чынам прыняць гэты саміт, — прадоўжыў Аляксандр Лукашэнка. — Ён пройдзе ў новым Палацы Незалежнасці і, напэўна, гэта ў нейкай ступені сімвалічна».

Прэзідэнт акцэнтаваў увагу на важнасці таго, каб «падтрымаць імідж Мінска па тэндэнцыі аб'яднання дзяржаў, наданні нашай інтэграцыі яшчэ больш глыбіннага характару».

Як падкрэсліў Сяргей Лебедзеў, Мінск ужо даўно называецца сталіцай СНД, паколькі тут знаходзіцца штаб-кватэра Садружнасці. У бліжэйшыя дні горад у прамым сэнсе слова стане сталіцай СНД, паколькі тут будуць кіраўнікі дзяржаў Садружнасці, міністры замежных спраў, і ў Мінску пройдуць вельмі важныя сустрэчы высокіх кіраўнікоў, якія прымуць рашэнні па актуальных пытаннях узаемадзеяння.

Старшыня Выканкама СНД канстатаваў высокую ступень гатоўнасці Беларусі да самітаў — і арганізацыйна, і па змесце. Паводле слоў Сяргея Лебедзева, адчуваецца вельмі вялікая зацікаўленасць Прэзідэнта Беларусі ў тым, каб сустрэчы прайшлі змястоўна, арганізавана.

На сустрэчы адбылося зацікаўленае абмеркаванне пытанняў падрыхтоўкі маючага адбыцца ў Мінску саміту СНД, у тым ліку парадку дня, ступені гатоўнасці пытанняў да абмеркавання на вышэйшым узроўні.

Усяго ў парадку дня сустрэчы прэзідэнтаў краін СНД 14 важных пытанняў, якія ахопліваюць усе сферы дзейнасці — эканамічную, гуманітарную, бяспекі.

Паводле слоў Сяргея Лебедзева, кіраўнікі дзяржаў у тым ліку разгледзяць чатыры пытанні, якія датычацца зацвярджэння праграм па барацьбе са злачыннасцю, гандлем людзьмі, наркабізнесам, тэрарызмам.

Прыярытэтнае месца на саміце зойме і гуманітарная тэматыка. На зацвярджэнне прэзідэнтаў вынесуць прапановы па культурных сталіцах СНД на будучы год. Савет па гуманітарным супрацоўніцтве прапануе прадаставіць у 2014 годзе гэты статус казахстанскаму гораду Алматы і кыргызскаму гораду Ош.

Сяргей Лебедзеў таксама расказаў аб тым, што старшыня Савета Міжпарламенцкай асамблеі СНД Валянціна Мацвіенка выступіць з інфармацыяй аб дзейнасці МПА па ўмацаванні інтэграцыйнага ўзаемадзеяння.

Важнай тэмай з'яўляецца і зацвярджэнне 2015 года як Года ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, што прымеркавана да 70-годдзя Перамогі. Акрамя таго, кіраўнікі дзяржаў зацвердзяць узоры адзіных юбілейных узнагарод у гонар 70-годдзя Перамогі.

Як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, беларускі бок гатовы да самітаў і мае намер правесці іх на самым высокім узроўні і з высокай эфектыўнасцю.

## ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ СТАРТУЕ Ў СНЕЖНІ

**Выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў Беларусі пройдуць не пазней за 25 сакавіка 2014 года. Пра гэта ў эфіры праграмы «Актуальны мікрафон» Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё заявіла старшыня Цэнтрвыбаркама Беларусі Лідзія Ярмошына.**

Выбарчая кампанія пачнецца ў снежні 2013 года. Старшыня ЦВК выказала надзею, што выбары ў мясцовыя Саветы пройдуць з улікам папраўак у выбарчае заканадаўства, якія разглядаюцца цяпер у парламенце. «Законапраект прыняты ў першым чытанні Палатай прадстаўнікоў. Прычым без істотных заўваг. Я спадзяюся, што ён будзе не толькі своечасова прыняты, але і апублікаваны хаця б за месяц ці 20 дзён да прызначэння выбараў, каб усе ўдзельнікі выбарчага працэсу падрыхтаваліся», — сказала Лідзія Ярмошына.

Старшыня ЦВК звярнула ўвагу, што змены ў выбарчым заканадаўстве істотна не закрануць мясцовыя выбары. «Усе істотныя навелы закранаюць першым чынам парламенцкія выбары», — растлумачыла Лідзія Ярмошына.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## А.ЛУКАШЭНКА: ПРЫ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДАГАВОРА АБ ЕЎРАЗІЙСКІМ ЭКАНАМІЧНЫМ САЮЗЕ «БУДЗЕ ЗЛАМАНА ВЯЛІКАЯ КОЛЬКАСЦЬ КОП'ЯЎ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся сёння з кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэем Кабяковым і прадстаўніком ад Беларусі ў Савеце Еўразійскай эканамічнай камісіі Сяргеем Румасам. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Гаворачы аб маючым адбыцца саміце СНД, Прэзідэнт адзначыў, што яго пытанні абмеркаваны на сустрэчы са старшынёй выканаўчага камітэта — выканаўчым сакратаром СНД Сяргеем Лебедзевым. Што датычыцца Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета, Аляксандр Лукашэнка папрасіў далажыць яму аб больш глыбокім змесце пытанняў, якія будуць унесены для абмеркавання кіраўнікам дзяржаў. «Тым больш што гэта найбольш складаныя пытанні, паколькі некаторыя знаходзяцца ў стадыі распрацовак у сувязі са стварэннем Еўразійскага эканамічнага саюза, які, як мы планавалі, пачне функцыянаваць з 1 студзеня 2015 года», — сказаў Прэзідэнт.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, як ідзе прапрацоўка зместу дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе. «Думаю, што там будзе зламана вялікая колькасць коп'яў, паколькі гэта закранае эканамічныя, фінансавыя інтарэсы дзяржаў, якія ўваходзяць сёння ў Мытны саюз. Ды і вялікая палітыка, — адзначыў Прэзідэнт. — Якая пазіцыя нашых партнёраў — Расіі і Казахстана ў гэтай частцы?».

Кіраўнік дзяржавы таксама прапанаваў абмеркаваць шэраг іншых актуальных напярэдадні саміту пытанняў, у тым ліку тых, па якіх ёсць пэўныя рознагалоссі ў партнёраў.

■ Ва ўрадзе

## РЭАЛЬНЫ СЕКТАР МАЕ ПАТРЭБУ Ў СТЫМУЛЯВАННІ

**Стымуляванне рэальнага сектара эканомікі і нарошчванне экспарту павінны стаць аднымі з галоўных прыярытэтаў у 2014 годзе. На гэтым акцэнтаваў увагу прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч на пасяджэнні Прэзідыума Саўміна. Тут разглядаліся праекты прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця, бюджэту, а таксама асноўныя напрамкі грашова-крэдытнай палітыкі на будучы год, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Міністр эканомікі Мікалай Снапкоў сказаў, што нарошчванне экспарту з'яўляецца галоўным фактарам росту эканомікі краіны. Перш за ўсё за кошт павышэння канкурэнтаздольнасці прадукцыі і выкарыстання фінансавых інструментаў, што і стане асновай павышэння прадукцыйнасці працы і росту заработнай платы. Тэмп росту паказчыка экспарту тавараў і паслуг у 2014 годзе згодна з праектам указа «Аб важнейшых параметрах прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2014 год» вызначаны на ўзроўні 107,2 працэнта.

«На працягу дзесяцігоддзя аснову даходаў ад экспарту Беларусь атрымлівала ад трох галін: нафтаперапрацоўкі і нафтахіміі, калію, чорнай металургіі. Менавіта яны фарміравалі да 48 працэнтаў экспартных патокаў. Максімум быў у 2012 годзе, — адзначыў Мікалай Снапкоў. — Менавіта іх скажаючы ўплыў на агульны экспарт адчуваецца сёння». Паводле ацэнак Мінэканомікі, экспарт у Расію ў 2014 годзе дасягне 110 працэнтаў. Такім чынам, адзначыў кіраўнік ведамства, для дасягнення ўзроўню 2012 года экспарт у іншыя краіны (акрамя Расіі і краін Еўрапейскага саюза) павінен быць забяспечаны за кошт 100-працэнтнай загрузкі магутнасцяў прадпрыемстваў па вытворчасці сельгасмашын, трактароў, аўтамабіляў, аўтобусаў, цэменту, шын, свініны, цукру, абутку. Ён дадаў, што ў аснову каркасіроўкі прагнозу на 2014 год пакладзена адпаведнасць фінансавых магчымасцяў і патрэб эканомікі ў наступным годзе.

Так, напрыклад, рост ВУП, паводле разлікаў Мінэканомікі, у 2014 годзе прагназуецца на ўзроўні 2,4 працэнта супраць раней прагназаваных 5,7 працэнта. Паказчык па прыцягненні прамых замежных інвестыцый устаноўлены ў аб'ёме $2,5 млрд.

«На гэты час у прагнозе 2014 года перагледжаны ўзровень інфляцыі да 14,5 працэнта (снежань да снежня). Гэта абумоўлена рэалізацыяй у плане стабілізацыі задачы па скарачэнні перакрыжаванага і бюджэтнага субсідзіравання і павышэння ўзроўню пакрыцця насельніцтвам затрат на жыллёва-камунальныя паслугі да 50 працэнтаў, а таксама ростам цэн на транспарт», — дадаў Мікалай Снапкоў.

Па выніках пасяджэння прэм'ер-міністр адзначыў, што згодны з агульнымі падыходамі фарміравання бюджэту на 2014 год, пры гэтым ён лічыць, што ў будучым годзе неабходна рэзкае зніжэнне стаўкі рэфінансавання. Міхаіл Мясніковіч даручыў у бліжэйшы час дапрацаваць праекты бюджэту і прагнозаў сацыяльна-эканамічнага развіцця на будучы год. У дакументах, паводле слоў кіраўніка ўрада, павінны быць адлюстраваны падыходы, якія забяспечваюць развіццё эканомікі краіны. ■

■ Наш фармат

## 2 МІЛЬЯРДЫ НА ДАБРАЧЫННАСЦЬ

**Менавіта столькі за два гады працы сабраў і пералічыў на дапамогу канкрэтным адрасатам — цяжкахворым дзецям, якія маюць патрэбу ў лячэнні і рэабілітацыі, а таксама дзіцячым дамам, сацыяльным прытулкам, школам-інтэрнатам — беларускі інтэрнэт-аўкцыён сустрэч «Мае Сэнс».**

За мінулы год пляцоўка праекта www.maesens.by шмат у чым змянілася і ўдасканалілася. «У нас з'явіліся новыя дабрачынныя ініцыятывы: дапамога беспрытульным жывёлам, культурна-адукацыйныя праграмы, запушчаны першы ў Беларусі конкурс сацыяльных праектаў Social Weekend — усё дзеля таго, каб як мага больш людзей уключалася ў рух бескарыслівай і крэатыўнай дапамогі іншым», — адзначаюць стваральнікі інтэрнэт-платформы. Дарэчы, як сведчыць праведзенае камандай праекта «Мае Сэнс» апытанне, 37% яго ўдзельнікаў пералічваюць грошы на дабрачыннасць, бо перакананы, што трэба дапамагаць усім, хто мае ў гэтым патрэбу; яшчэ 16% вельмі любяць дзяцей, а 12% прываблівае пазітыўны, ненавязлівы і зразумелы фармат збору сродкаў.

Агульная колькасць карыстальнікаў сайта на сёння складае амаль 62000 чалавек, сярод якіх шмат беларускіх выканаўцаў, спартсменаў, тэлевядучых, бізнесменаў. Адбылося звыш 40000 аўкцыёнаў, сустрэч з цікавымі людзьмі па ўсёй краіне, а сума дапамогі, пералічаная на дабрачынныя мэты, перавысіла 2 мільярды беларускіх рублёў.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК** ■

# ЯКОГА КОЛЕРУ ВОСЕНЬ ЖЫЦЦЯ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пакуль клопат мужчыны аб бабулі нельга назваць у чыстым выглядзе патранатам, бо грошы за гэта Рыбакоў не атрымлівае.

— Проста дапамагаю бабулі і раблю гэта бясплатна — ужо больш за дваццаць гадоў. Яна для мяне — амаль родны чалавек. Дзяцей у яе няма, адзінокая. Прыязджалі з сельскага Савета, прапаноўвалі ёй сацыяльны ложак. Яна нікуды не хоча пераязджаць, просіць: «Толькі не кідай, не «аддавай» мяне нікуды». Дык не хачу ж браць грэх на душу! Шкада мне чалавека, — кажа Аляксандр Андрэевіч.

Ён жыве ў суседняй вёсцы, да якой — прыкладна кіламетр. Кожны дзень прыходзіць або прыязджае да бабулі на веласіпедзе. Яго жонка Любоў Сямёнаўна не супраць таго, каб муж займаўся дабрачыннасцю. І сын з дачкой, якія жывуць у Віцебску, бывае, дапамагаюць. Сам Рыбакоў ужо двойчы дзед.

— Адзін час яна ў нас у вёсцы жыла. Замужам не была, жыла грамадзянскім шлюбам. Але мужчына яе памёр. І брат яе памёр, і сястра памерла гадоў шэсць таму. Я спачатку проста дапамагаў, а поўнасцю дагледзяю гадоў пяць, — працягвае мужчына.

Расказаў, што спатрэбілася яшчэ большая дапамога, калі пару гадкоў таму Раіса Сямёнаўна захварэла на поліартроз (хвароба суставаў. — **Аўт.**). Сама ледзь рухаецца. Штодня мужчына гатуе і корміць старую, а таксама частуе яе тым, што перадала жонка, прадукты прывозіць, сена косіць, агарод апрацоўвае.

— З жонкай зааралі бабулі зямлю, пасадзілі бульбу, моркву, цыбульку... 5 сотак зямлі я ёй апрацоўваю, а ўсяго ў яе 24 соткі. Навошта ўчастак запускаць? Пенсія ў яе 1,8 мільёна рублёў. Цяжка на гэтыя грошы ў вёсцы пражыць, ды яшчэ хворай. Дроў трэба? Заказваеш трактар з дровамі, а яны каштуюць 1,5 мільёна рублёў. Пакалоць — яшчэ 300 тысяч рублёў бяруць. Пенсіі, лічы, няма. А каб заараць, узяць каня, плаці прыватніку па 25-30 тысяч рублёў за сотку. Зараз у мяне няма свайго каня, а раней быў, — расказвае аб гаспадарскіх справах мужчына.

Паводле яго слоў, за бабулю не толькі ён перажывае. Вось электрыкі бясплатна памянялі праводку, а ён збіраецца «схаваць» тыя правады пад новымі шпалерамі.

На Новы год, на 8 Сакавіка заўсёды дорыць бабульцы гасцінцы. Паводле яго слоў, мала хто з землякоў разумее яго ўчынкі. І чуткі розныя пускаюць: маўляў, хоча за гэта нешта атрымаць! Ды Аляксандр Андрэевіч ужо не звяртае ўвагі на такія размовы.

### Патрабаваць прасцей...

У вёсцы Смалоўка знаходзіцца аддзяленне кругласутачнага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў.

— Наша ўстанова разлічана на адначасовае пражыванне 28 чалавек. Зараз у нас — 25, сярод іх — мужчын. Адно мужчынскае і два жаночыя месцы свабодныя. Самы малады жыхар — 1965 года нараджэння. Ёсць тыя, каму пад 90 гадоў. У штаце супрацоўнікаў разам са мной 11 чалавек, — расказвае **Ала КУЗЬМІНА, загадчыца аддзялення кругласутачнага знаходжання.**

Калі паказвала мне ўстанову, пазнаёміла з мужам і жонкай. Таццяна


Аляксандр Рыбакоў і яго падапечная

Іванаўна нарадзілася ў 1949 годзе, муж старэйшы за яе. Да выхаду на пенсію жыла ў Казахстане, потым прыехала да мамы ў Куйбышаў, ды мама памерла на яе руках.

— Прапісацца ў яе кватэры не паспела. У Беларусь пераехала і ўладкавалася на працу ў саўгас. У вёсцы раней ніколі не жыла. На працы і пазнаёмілася з будучым мужам Васілём Васільевічам Трафімавым. Нядаўна ён хварэў — кровазліццё ў мозг, толькі нядаўна выпісаўся. Цяпер жывём тут — не адны ўсё ж. У нас жа ні дзяцей, ні свяякоў няма, ніхто да нас не прыязджае. Тры разы ў дзень тут нас кормяць, а ўвечары сок або кефір даюць. Можна і ў аўталаўцы нешта купляць.

У аддзяленні — утульнасць і чысціня. Дапамагаюць і мецэнаты.

— Міжнародная дабрачынная арганізацыя «Сафія» купіла посуд, стэлажы, шафы, сушылку. Участак зямлі ў нас ёсць. Летась ураджай быў вельмі добры, амаль цалкам забяспечылі сябе бульбай. Вырошчваем таксама гародніну: капусту, моркву, цыбулю, агуркі, памідоры, а сэканомленыя грошы трацім на іншыя мэты. Калі ў каго з нашых жыльцоў ёсць жаданне і гэта дазваляецца па стане здароўя, могуць працаваць.

Адна з жанчын, калі з ёю гутарыў, паскардзілася, што ёй мыла не даюць, хоць і 85% з пенсіі вылічваюць на ўтрыманне.

Высветлілася, што ў жанчыны ёсць сын, ды ён сюды не прыязджае, сама яна — раней судзімая... Няўжо за грошы, якія ёй з пенсіі застаюцца, не можа мыла купіць па цане некалькі тысяч рублёў? Можа. Але ў дзяржавы патрабаваць прасцей.

### І ўрачы, і медсёстры

Бабулі, якія пражываюць у Гарадку ў адной кватэры разам, аўтара гэтых радкоў зарадзілі аптымізмам. Антаніна Малахаўна Іванова, 1928 года нараджэння, і Надзея Канстанцінаўна Ганчарова, 1931 года нараджэння, — залоўкі. Вельмі хвалілі сацыяльнага работніка Іну Уладзіміраўну Кацюшкіну, якая прыходзіць да іх чатыры разы ў тыдзень, прадукты прыносіць, прыбірае кватэру.

— Ужо хутка тры гады, як мы тут, — расказвае Надзея Канстанцінаўна.

— Я ўжо ў Смалоўцы пабыла, дзе шмат людзей разам жывуць, — не спадабалася. А адной няма як мне жыць: кватэра вялікая ды без выгод, — гаворыць Антаніна Малахаўна.

Надзея Канстанцінаўна нарадзілася ў Гарадоцкім раёне. А залоўка — ва Украіне, у Данецкай вобласці. Пераехала ў БССР яшчэ да вайны разам з бацькамі. Расказвае, што дакладна не ведае, колькі ёй гадоў, бо ўкраінскія дакументы ў вайну «зніклі». Які год нараджэння мама сказала, такі і запісалі.

Абедзве да выхаду на пенсію працавалі рабочымі на льнозаводзе. А цяпер вось адна за другую нясуць адказнасць — падтрымліваюць, турбуюцца.

— Вось яна захварэла, не можа нічога па доме рабіць, а я магу яшчэ — тады ўсё раблю. А калі я захварэю, яна будзе рабіць. У яе ногі дрэнна ходзяць, мае — крыху лепш. Яшчэ і ў краму схадзіць магу. У нас свой апарат ёсць, каб ціск мераць — самі ўрачы і медсёстры, — працягвае Надзея Канстанцінаўна.

Пацікавіўся распарадкам дня бабуль. Прачынаюцца ў 7-8 раніцы. Засынаюць, бывае, і ў 9-10 гадзін вечара. Пакуль гутарылі, у госці зайшла іх добрая сяброўка, якая па ўзросце магла быць ім за ўнучку. Яна часам дапамагае — напрыклад, вокны мыць прыходзіць.

Дарэчы, у іх кватэры новыя пластыкавыя вокны. Бабулі сказалі, што самі заказалі і аплацілі іх устаноўку. І дзверы добрыя такім жа чынам паставілі, і падлогу добрую па іх заказе наслалі. Жывуць у цяпле і ўтульнасці, тэлевізар глядзяць...

Вельмі шмат пазітыву ў гэтых людзях. Пажартавалі, што яшчэ, можа, і замуж выйдуць! Каб толькі жаніхі былі поўныя сіл. «Дажынкі» ў наступным годзе ў Гарадку пройдуць, дык бабулькі абавязкова збіраюцца на свята.

### І ў сядзібах жывуць

**Вера Мікалаеўна АСТАПЕНКА, начальнік упраўлення сацыяльнай падтрымкі насельніцтва і стацыянарных устаноў Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама,** канстатуе, што новыя формы працы ў першую чаргу прымяняюцца з улікам настрою і пажадання саміх пажылых людзей.


Гарадоцкія бабулі

— Правеўшы сацыялагічныя апытанні, сустрэчы з пажылымі грамадзянамі, мы высветлілі, што многія хочуць жыць ва ўмовах, як мага больш набліжаных да хатніх, і там, дзе пражылі шмат гадоў. Таму шырокае распаўсюджванне атрымліваюць такія формы жыццеўладкавання пажылых грамадзян, як «дамы зімоўкі», прыёмная, гасцявая, патранатная сем'і. Сацыяльныя паслугі ў такой форме атрымліваюць ужо каля 250 чалавек. Што тычыцца эканамічнага эфекту. Дзесяць аддзяленняў кругласутачнага знаходжання з сярэдняй напаўняльнасцю 25 чалавек — лічыце, тыя ж 250 чалавек. Гадавыя выдаткі на ўтрыманне аднаго такога аддзялення — у сярэднім 1 мільярд рублёў. Адпаведна, утрыманне дзесяці такіх устаноў — 10 млрд. У той жа час затраты на заработную плату сацыяльнага работніка ў год складаюць 34 мільёны рублёў. На абслугоўванне 250 чалавек неабходна задзейнічаць 27 сацыяльных работнікаў, — значыць, выдаткі на іх заработную плату за год складуць 918 мільёнаў рублёў, — кажа яна.

Паводле слоў Веры Мікалаеўны, будзе мэтазгодным у Год беражлівасці ўкараніць у кожным раёне, горадзе вышэйзгаданыя формы жыццеўладкавання пажылых грамадзян. Адной з эканамічна выгадных форм з'яўляецца і... накіраванне зімой у аграэкасядзібы, якія ў гэты перыяд не запатрабаваны. Якім чынам?

— Складаецца дагавор з кіраўніком аграэкасядзібы. Паводле гэтага дакумента,чалавеку прадастаўляецца спальнае месца, ён забяспечваецца трохразовым харчаваннем на дзень, пасцельнымі рэчамі, яму прапальваюць печ, мыюць бялізну... За гэта штомесяц у бюджэт «Дома зімоўкі» ён уносіць суму ў памеры 1,2 мільёна рублёў. Такое ўжо практыкуецца ў Глыбоцкім раёне, і, лічу, новая форма абслугоўвання павінна быць укаранёна і ў іншых раёнах вобласці. Калі ўсе магчымасці знаходжання ў хатніх умовах пажылога чалавека вычарпаныя, прапануецца іх размяшчэнне ў аддзяленні кругласутачнага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў. У вобласці функцыянуюць 20 аддзяленняў (усяго ў рэспубліцы іх — 58) на больш як 650 ложка-месцаў, — дадала Вера Астапенка.

Сёлета аддзяленне адкрыта ў Шумілінскім раёне (на 30 месцаў). Плануецца завяршэнне рамонтных работ і ўвод у эксплуатацыю аддзялення ў Бабінавічах Лёзненскага раёна, а таксама адкрыццё пакояў павышанай камфортнасці ў аддзяленнях Мёрскага, Лёзненскага, Пастаўскага, Сенненскага, Талачынскага, Бешанковіцкага раёнаў. Праблемным застаецца пытанне іх поўнай запаўняльнасці, бо дома ці «амаль што дома» заўсёды лепш.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*Гарадоцкі раён.*

■ 36,6 °

# ТАДЫ НЕ БУДЗЕ СКАЛІЁЗУ

**Постаць — адзін з паказчыкаў нашага здароўя. Для кожнага віду парушэння постаці характэрнае сваё размяшчэнне пазваночніка, лапатак, таза і ніжніхканечнасцяў. Адхіленне пазваночніка ўбок — гэта скаліёз, а наперад — сутуласць. Скрыўленне пазваночніка і парушэнне постаці можа быць прыроджаным і набытым, тлумачыць інструктар-валеолаг 23-й гарадской дзіцячай палiклінікі г. Мінска Ірына ШЫМАНСКАЯ.**

Прыроджаныя прычыны звязаны з паталогіямі ўнутрывантробнага развіцця. У астатніх выпадках на постаці адмоўна адбіваюцца:

— захворванні (рахіт, поліяміэліт, туберкулёз, плеўрыт, радыкуліт);

— пераломы пазваночніка;

— фізіялагічныя асабліваці (плоскаступнёвасць, розная даўжыня ног або адсутнасць адной нагі, касавокасць або блізарукасць, якія вымушаюць прымаць няправільную позу падчас вучобы ці работы);

— прафесійная дзейнасць, якая прымушае доўгі час сядзець з пастаянна нахіленай галавой, у няправільнай позе;

— недастатковая рухальная актыўнасць дзіцяці;

— захапленне аднастайнымі практыкаваннямі;

— няправільнае фізічнае выхаванне;

— несправільныя навакольнае асяроддзе.

Да няправільных поз бацькі часам самі прывучаюць сваіх дзяцей. Скажам, ложак новнароджанага ставіцца так, што гук і святло падаюць з аднаго боку. Да таго ж бацькі падыходзяць да дзіцяці таксама з аднаго боку. Малое рэфлекторна паварочвае галаву ў той жа бок. Адбываецца скрыўленне косці чэрапа, і дзеці далей вымушаны ляжаць толькі на больш «зручным» баку. Так набываюцца пэўныя дэфармацыі. Калі бацькі ў такіх выпадках своечасова звяртаюцца да ўрача, то лячэнне бывае досыць паспяховым і без хірургічнага ўмяшання. У спозненых выпадках аперацыя непазбежная, можа развіцца шыйна-грудны скаліёз.

Фарміраванне правільнай і прыгожай постаці пачынаецца з нараджэння дзіцяці, і асноўныя складнікі вызначаюцца да 6-7 гадоў.

**Для правільнай і прыгожай постаці неабходна:**

1. Своечасова выкладваць дзіця на жывот, прывучаць яго поўзаць.

2. Не спяшацца ставіць на ножкі (варта дачакацца патрэбнага часу, няхай даўжэй поўзае).

3. На прагулцы менш вадзіць за руку, каб не ствараць нахіл тулава ўбок. Можна карыстацца якімі-небудзь прыстасаваннямі (грудным рэменем).

4. Змагацца з такімі шкоднымі звычкамі, як стаяць на паўсагнутай назе, сядзець, падціснуўшы пад сябе ногі, нахіліўшыся ўбок ці наперад.

5. Ставіць крэсла перад сталом так, каб яго край на 2-3 см заходзіў пад край стала. Пажадана падкладваць пад ногі якую-небудзь падстаўку, калі яны не дастаюць да падлогі.

6. Падбіраць мэблю для заняткаў і гульняў адпаведна росту.

7. Падчас заняткаў у класе і дома пажадана праводзіць 3-хвілінныя фізкультурныя паўзы.

8. Спаць на правым баку (але не «калачыкам»), на паўжорсткім ложку з невялікай падушкай.

9. Не чытаць на баку, не насіць цяжар у адной руцэ.

10. Гуляць на свежым паветры, гуляць у рухавыя гульні, займацца гімнастыкай, катацца на лыжах, каньках, плаваць.

11. Выконваць практыкаванні на баланс з прадметамі на галаве.

12. Не менш за 3 разы на тыдні неабходна трэніраваць мышцы спіны і брушнога прэса. У фарміраванні постаці важную ролю іграюць пазваночнік і мышцы вакол яго.

**Святлана БАРЫСЕНКА** ■

■ Меркаванне



# ЧАМУ АРМЕНІЯ АБРАЛА МЫТНЫ САЮЗ: ПОГЛЯД З БЕЛАРУСІ

**Сумесная заява прэзідэнтаў Расіі Уладзіміра Пуціна і Арменіі Сержа Саргсяна аб далучэнні Арменіі да Мытнага саюза для многіх зацікаўленых асоб стала «раптоўнай нечаканасцю». Між іншым, нічога такога сенсацыйнага гэты акт армянскай міжнароднай палітыкі не ўяўляе — хутчэй, наадварот, здзіўляе тое, што Арменія дагэтуль не далучылася да краін — удзельніц «мытнай тройкі». Зыходзячы з сітуацыі сучаснага існавання армянскай дзяржавы, іншага геапалітычнага выбару яе кіраўніцтва зрабіць проста не магло.**



## Адзіная магчымасць

Безумоўна, сярод дзяржаў Мытнага саюза асноўным партнёрам Арменіі выглядае Расія. Важнасць стратэгічнага саюзу з Расіяй у сістэме міжнародных прыярытэтаў Арменіі цяжка пераацаніць. Асобныя армянскія і незалежныя аналітыкі мяркуюць, што сам факт суверэннага развіцця армянскай дзяржавы магчымы толькі пры ўмове вайскова-палітычнай падтрымкі з боку Расійскай Федэрацыі. Нагадаем, што Арменія знаходзіцца ў сітуацыі фактычнай эканамічнай блакады і пастаяннай ваеннай пагрозы з боку Азербайджана і Турцыі, з якімі мае нявырашаныя пытанні вакол статусу непрызнанай рэспублікі Нагорны Карабах, а таксама канфлікт вакол адмовы турэцкага кіраўніцтва прызнаць факт генацыду армянскага народа і анексіі часткі армянскай тэрыторыі, што ажыццяўлялася ўладамі Асманскай імперыі ў першай чвэрці XX стагоддзя.

Як у вайсковым, так і ў эканамічным плане багатыя Турцыя і Азербайджан маюць пэўныя перавагі перад невялікай армянскай дзяржавай, што не валодае значнымі запасамі карысных выкапняў і матэрыяльнымі сродкамі, таму, нягледзячы на асабістыя якасці армянскіх вайскоўцаў, наўрад ці гэта краіна мае магчымасць самастойна адстаяць уласную суб'ектнасць у варожым акружэнні.

У гэтых умовах, адразу пасля распаду СССР, афіцыйным Ерэванам быў узяты курс на стварэнне вайскова-палітычнага саюзу з Расіяй як гаранты незалежнасці. Так, Арменія з'яўляецца адной з краін — удзельніц АДКБ, у горадзе Гюмры знаходзіцца расійская вайсковая база, дзе размешчана каля 5 тысяч вайскоўцаў, памежныя часткі ФСБ Расіі ажыццяўляюць ахову армянскай дзяржаўнай мяжы.

Звышважнай з'яўляецца такса-

> **Прыбыткі ад працоўных мігрантаў, занятых у Расіі, штогод складаюць суму, блізкую да дзяржаўнага бюджэту Арменіі.**

ма роля Расіі ў фарміраванні армянскай эканомікі: акрамя энергетычнай залежнасці, існуе пэўная залежнасць ад Расіі як асноўнага напрамку міграцыйных патокаў — з 13 мільёнаў армян каля 10 мільёнаў знаходзіцца па-за межамі радзімы, у тым ліку значная частка працуе ў Расійскай Федэрацыі. Прытым прыбыткі ад працоўных мігрантаў, занятых у Расіі, штогод складаюць суму, блізкую да дзяржаўнага бюджэту Арменіі. Гэтак жа значнай з'яўляецца прысутнасць расійскага бізнесу ў жыццяздольных сектарах армянскай прамысловасці і сферы паслуг. Да прыкладу, важнейшая транспартная артэрыя краіны — Паўднёва-Каўказская чыгунка з'яўляецца «дачкой» Расійскай чыгункі. Падобная сітуацыя склалася і ў іншых прыбытковых сферах армянскай эканомікі.

Такім чынам, выбар армянскага кіраўніцтва на карысць далучэння да Мытнага саюза з'яўляецца не толькі адзіна магчымым і неабходным, але і цалкам апраўданым як з вайскова-палітычных, так і эканамічных прычын.

## Небяспечная логіка супрацьстаяння

У такой сітуацыі з беларускага пункту гледжання цікава выглядае не сам факт далучэння Арменіі да МС, але тыя дыпламатычныя дэкларацыі і каментарыі, што з'явіліся ў інфармацыйнай прасторы пасля гэтага кроку афіцыйнага Ерэвана. Справа ў тым, што ў міжнароднай палітыцы Арменія заўжды карысталася так званым «кампліментарным прынцыпам», што дазваляў выбудоўваць канструктыўныя адносіны з рознымі дзяржавамі і наднацыянальнымі блокамі, нават пры наяўнасці ў іх супрацьлеглых пазіцый у дачыненні адзін да аднаго. Такая знешнепалітычная лінія з'яўляецца цалкам адэкватнай міжнароднаму становішчу Арменіі, якая знаходзіцца ў несяброўскім акружэнні і проста не можа сабе дазволіць пашыраць зону канфліктнасці.

Яшчэ вясной 2013 года Арменія паведаміла аб намеры падпісаць дагавор аб асацыяцыі і зоне свабоднага гандлю з Еўрапейскім саюзам. Пры гэтым адэпты ідэі еўраінтэграцыі як з армянскага, так і з еўрапейскага боку не бачылі факт вайскова-палітычнага саюза Арменіі і Расіі ў якасці перашкоды гэтаму кроку. Доўгі час ніякіх негатыўных заяў адносна «кампліментарнай палітыкі» Ерэвана не было не толькі з боку ЕС, але і Расіі ды іншых дзяржаў, схільных да еўразійскай інтэграцыі. Наадварот, Арменія працягвала актыўнае супрацоўніцтва ў СНД і АДКБ: вясной 2013 года ў Ерэване ўрачыста прайшоў Еўразійскі моладзевы форум, а затым адбыўся візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі.

8 жніўня 2013 года падчас візіту ў Расію армянскага лідара Сержа Саргсяна на сумеснай прэс-канферэнцыі прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін адзначыў: «Мы абмеркавалі інтэграцыйныя працэсы на постсавецкай прасторы і прынялі рашэнне аб стварэнні сумеснай камісіі, што вызначыць, як можна прымяніць апошнія дамовы ў рамках Мытнага саюза Расіі, Казахстана, Беларусі адносна Арменіі». Такім чынам, відавочна, што выбар на карысць удзелу ў Мытным саюзе быў зроблены армянскім кіраўніцтвам задоўга да 3 верасня і з'явіўся вынікам шэрагу паслядоўных дыпламатычных дзеянняў і міжнародных мерапрыемстваў, а не «раптоўнай сенсацыяй», як тое падалося асобным палітолагам і журналістам.

Гэтак жа ясна, што падобны выбар у вачах армянскай эліты не супярэчыў намеру заключыць партнёрскія дамоўленасці з Еўрапейскім саюзам. Аднак пасля афіцыйнага паведамлення аб намеры Арменіі далучыцца да Мытнага саюза курс на еўраінтэграцыю аказаўся фактычна звернуты. Кіраўніцтва Еўрапейскага саюза вуснамі камісара па пытаннях пашырэння і палітыкі добрасуседства Штэфана Фюле заявіла аб адмове ад планаў заключэння дамоўленасцяў з Арменіяй.

У гэты час у расійскіх сродках масавай інфармацыі пачаўся парад гучных і не зусім карэктных заяў розных экспертаў і палітолагаў аб тым, як «армянам па-бацькоўску патлумачылі палітыку партыі». Склалася ўражанне, што далучэнне да Мытнага саюза з'яўляецца не суверэнным крокам армянскай дзяржавы, якія падтрымлівае каля 70% насельніцтва, а вынікам ціску з боку Расійскай Федэрацыі, які «вы-

> **Выбар армянскага кіраўніцтва на карысць далучэння да Мытнага саюза з'яўляецца не толькі адзіна магчымым і неабходным, але і цалкам апраўданым як з вайскова-палітычных, так і эканамічных прычын.**

мусіў Арменію адмовіцца ад супрацы з ЕС на карысць Мытнага саюза». Між іншым, чамусьці, не відаць з заяў еўрапейскага кіраўніцтва, не Арменія пад ціскам Расіі адмовілася ад асацыяцыі з ЕС, а менавіта Еўрапейскі саюз адмовіўся ад далейшага ўзаемадзеяння з Арменіяй у сувязі з курсам афіцыйнага Ерэвана на далучэнне да Мытнага саюза.

Такая логіка супрацьстаяння, калі міжнароднымі элітамі на словах дэкларуецца схільнасць да стварэння адзінай Еўропы і глабальнага рынку ад Атлантыкі да Ціхага акіяна, а на практыцы дзяржавы аказваюцца перад выбарам «альбо—альбо», павінна быць улічана ў беларускай міжнароднай палітыцы. Бо менавіта дзякуючы падобнаму антаганізму родных народаў заходняй і ўсходняй частак еўрапейскай цывілізацыі Беларусь неаднаразова аказвалася ў якасці арэны крывавых войнаў і канфліктаў. Рэспубліка Беларусь, як ніякая іншая краіна ў Еўропе, зацікаўлена ў ліквідацыі супярэчнасцяў на прасторах Еўразіі і ў мірным суіснаванні ды супрацоўніцтве між асобнымі дзяржавамі і геапалітычнымі блокамі. Між іншым, менавіта такое бачанне ляжыць у аснове міратворчай місіі беларускай дыпламатыі на постсавецкай прасторы, і з гэтых пазіцый трэба разглядаць заявы беларускага кіраўніцтва аб тым, што наша краіна гатова аказаць усю неабходную дапамогу Арменіі на шляху далучэння да Мытнага саюза.

**Аляксандр ШПАКОЎСКІ**

■ У падарожжа — усёй сям'ёй

# ПАКАЖЫЦЕ ДЗЕЦЯМ ПІРАМІДЫ!

**Існуе міф, што падарожнічаць з дзецьмі — не лепшая ідэя: яны могуць захварэць, будуць надакучваць бацькам і не дадуць ім накупацца ў моры, ды і, маўляў, малечы ўвогуле не да далёкіх паездак. Аднак гэта не так: тое ж мора ўзмацняе імунную сістэму, ды і пакупацца можна разам.**

Зарына Бабко, маці дзвюх малалетніх дочак і журналіст сямейнага экагіда «Яблык ад яблыні», паставіла перад сабой мэту развянчаць усе «міфы», якія заклікаюць адмаўляцца ад сумесных паездак з дзецьмі. Сёлета яна з сям'ёй пабывала на трох морах, і прывезлі яны з сабой толькі прыемныя ўражанні.

Напэўна, самая галоўная боязь — гэта страх, што дзіця захварэе. «Проста ўспомніце пра страхавы поліс, — раіць маці-падарожніца. — Урэшце, захварэць яны могуць і дома».

Амаль усюды малыя да двухгадовага ўзросту могуць ездзіць бясплатна — гэта тычыцца авіябілетаў, пражывання ў атэлі (маленькі ложак для немаўляці ў пакой ставяць бясплатна)... Але калі вы падарожнічаеце з больш дарослымі дзецьмі, тады прыйдзецца набываць усё «па поўнай праграме». Тым не менш тут можна сэканоміць: чым купляць у турыстычнай фірме паездку, дзе «ўсё ўключана», паспрабуйце самі сабе стаць тураператарам. «Даведайцеся больш пра саму краіну, пра цэны там, а самастойна забраніраваць нумары ў атэлі — не такая ўжо і цяжкая справа», — дзеліцца вопытам Зарына Бабко.

Зноў жа, толькі на першы позірк можа падацца, што маленькаму дзіцяці не цікавыя новыя гарады і краіны. Наадварот, малеча добра запамінае ўсё новае, калі бачыць гэта на ўласныя вочы — напрыклад, аповеды пра піраміды і вярблюдаў каля гэтых самых пірамід і вярблюдаў. Пагадзіцеся, ёсць розніца паміж тым самым, але расказаным на ўроках. Да таго ж у дзіцячым узросце лёгка запамінаюцца не толькі розныя гісторыі і факты, але і іншамоўныя словы. Таму падчас падарожжаў дзіця можа заадно і мову папрактыкаваць.

«Але што сапраўды будзе ледзь не сапраўдным «катаваннем» для карапуза, — як запэўнівае Зарына, — дык гэта прагулкі па музеях і карцінных галерэях». Тут можна пайсці на кампраміс — выбраць музеі, дзе шмат цікавых інсталяцый, да якіх можна дакрануцца (напрыклад, музей-тэатр Сальвадора Далі ў Фігерасе, Іспанія), спецыяльныя дзіцячыя музеі, паспрабаваць правесці для малых уласную экскурсію — так і ў саміх бацькоў будзе магчымасць паглядзець на шэдэўр з іншага боку.

Адзін з самых распаўсюджаных страхаў, з-за якіх малыя застаюцца дома, — пагроза, што дзіця можа згубіцца ў чужой краіне. Напрыклад, на пляжы, дзе шмат людзей, або ў атэлі... Маладая маці-падарожніца прызналася, што такія страхі ёсць і ў яе, але з мужам яны заўсёды дамаўляюцца, што калі, напрыклад, мама купаецца, то тата — «за нянькy». А яшчэ на пляжах часта можна сустрэць такія ж сем'і з малымі дзецьмі. Тады з імі можна пасябраваць і хадзіць купацца па чарзе.

Зарына Бабко не толькі падарожнічае з малымі, але і піша на гэтую тэму ва ўласным блогу, праводзіць майстар-класы. Адзін з іх я наведала. Што цікава, наведвальнікі заўсёды дзеляцца і сваім вопытам ад падарожжаў з дзецьмі.

Так, Наталля Краўчук, маці траіх дзяцей, ездзіла з імі адпачываць у Румынію ў саляныя пячоры. Набываць тур было б дорага, таму жанчына знайшла ў інтэрнэце танны двухзоркавы атэль і забраніравала там нумар. «Паколькі жыць мы павінны былі там некалькі тыдняў, то некаторую працу малыя пачалі выконваць самастойна. У атэлі не было пральнай машыны, таму, напрыклад, свае шкарпэткі яны мылі самі. Калі сям'я вярнулася дадому, дзеці не забылі пра тое, чаму навучыліся».

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

■ Эканоміка педагогікі

# КАЛІ ГРОШЫ ІДУЦЬ ЗА ВУЧНЕМ, ХТО Ў ВЫЙГРЫШЫ?

## ...у латвійскіх педагогаў ужо ёсць адказ на гэтае пытанне

**Сістэма фінансавання ўстаноў адукацыі, калі грошы ідуць за канкрэтным дзіцем, мае як плюсы, так і мінусы. Такой думкі прытрымліваюцца прадстаўнікі прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Латвіі (LIZDA), якія днямі наведалі Беларусь. Латвійскія педагогі падзяліліся сваім досведам укаранення новай сістэмы фінансавання (яна прымушае педагогаў змагацца за кожнае дзіця) і расказалі, якія праблемы сёння даводзіцца вырашаць прафсаюзнаму активу ў Латвіі.**
**У гутарцы ўзялі ўдзел намеснік старшыні LIZDA Яніс КРАСЦІНЬШ, эксперт LIZDA па пытаннях агульнай адукацыі Модра ЯНСАНЕ, выкладчык Латвійскага ўніверсітэта Расма МОЗЭРЭ і настаўнік першай гімназіі г. Елгава Інара РАДЧАНКА.**

### Чаму школы не «гумавыя»?

**Яніс КРАСЦІНЬШ:**

— Сістэма адукацыі ў Латвіі пасля распаду Савецкага Саюза змянілася кардынальна. Прафсаюз работнікаў адукацыі і навукі LIZDA аб'ядноўвае ў сваіх радах толькі 60% ад агульнай колькасці педагагічных работнікаў. Ёсць арганізацыі, дзе ўвогуле адсутнічаюць прафсаюзныя ячэйкі, а ёсць і іншыя прыклады, калі членамі галіновага прафсаюза з'яўляюцца 90-100 працэнтаў ад агульнай колькасці работнікаў арганізацыі.

У свой час мы змагаліся за тое, каб заробак педагогаў прывязаць да сярэдніх заробкаў у грамадскім сектары з каэфіцыентам 1,2 або 1,3. Але дзяржава на гэта не ідзе, паколькі адначасова з ростам заробкаў у грамадскім сектары трэба будзе павышаць і заробкі педагогам.

Сістэма, калі **грошы ідуць за вучнем,** была ўкаранёна ў Латвіі па настойлівых рэкамендацыях Сусветнага банка, паколькі на той момант у Латвіі было шмат школ з невялікай колькасцю вучняў. І што мы ў выніку атрымалі? Школы сталі масава закрывацца. Безумоўна, калі ў вашай школе шмат дзяцей — у вас шмат грошай, а калі можаце больш заплаціць настаўнікам, вы — у выйгрышы. А што рабіць педагогам сельскіх школ? Калі Беларусь таксама пяройдзе на аналагічную сістэму фінансавання, то трэба загадзя прадумаць, што чакае невялікія школы, і як абараніць педагогаў гэтых школ. У тым ліку і ў плане іх заробкаў. Трэба прадугледзець для настаўнікаў нейкія гарантыі. У нас гэта сістэма, на жаль, не адпрацавана. І мы не можам гарантаваць педагогам ліквідаваных школ працаўладкаванне.

**«У асноўнай школе Латвіі колькасць педагогаў-мужчын вагаецца ў межах 3-4 працэнтаў, а ў старшай школе (10—12-ы класы) мужчынскае прадстаўніцтва павялічваецца да 8%».**

**Расма МОЗЭРЭ:**

— Школы, якія не вытрымлівалі канкурэнцыі, закрываліся не толькі ў сельскай мясцовасці, але і ў гарадах, у тым ліку ў Рызе. І заўсёды побач з прадстаўніком рыжскай Думы знаходзіўся і прадстаўнік прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі.

**Інара РАДЧАНКА:**

— Калі ўкараняецца сістэма фінансавання ўстановы адукацыі з разліку на кожнага вучня, вельмі важна адразу абмежаваць колькасць вучняў у класе. Бо мы сутыкаліся проста з абсурднымі сітуацыямі, калі ў класе было столькі парт, колькі там фізічна магло размясціцца. Але калі ў старшых класах трохі больш за 30 вучняў яшчэ можна прыняць, то ў першым класе — гэта недапушчальна. Мінімальная колькасць вучняў у класе ў сельскай мясцовасці складае 8 чалавек, у гарадскіх — 18, у Рызе — 20 вучняў. А вось верхняе абмежаванне адсутнічае. І ў гэтай сітуацыі колькасць не пераходзіць у якасць: якасць проста не можа «дайсці» да кожнага вучня.

У некаторых латвійскіх школах харчаванне для вучняў часткова або цалкам бясплатнае. Усё залежыць ад таго, ці датуе яго мясцовае самакіраванне. Але гэта таксама адзін з інструментаў, які выкарыстоўваецца для прыцягнення ва ўстановы адукацыі вучняў.

Між іншым, школьныя педагогі лічаць, што цалкам бясплатным харчаванне быць не павінна, паколькі ўсё, што бясплатна, не цэніцца школьнікамі. Лепш датацыя, чым дармавы абед.



### Пасля 16.00 — настаўніка не турбаваць!

**Яніс КРАСЦІНЬШ:**

— Адукацыя — гэта і наша, і ваша будучыня. Таму трэба думаць, як зрабіць так, каб педагогі атрымлівалі за сваю работу годную заробатную плату. Нашы педагогі на нас крыўдзяцца, кажучы, што мы недастаткова змагаемся за іх заробкі.

Розніца ў заробках настаўнікаў латвійскіх школ даволі істотная: у буйной школе, дзе шмат вучняў, настаўнік можа атрымліваць і 800 латаў (гэта больш як 1100 еўра), і нават 1000 латаў, а ў маленькай — менш як 280 латаў. А паколькі гадзін на стаўку настаўніку не хапае, ён вымушаны паралельна працаваць і ў іншай школе. А гэта дадатковыя выдаткі на бензін, якія яму ніхто не кампенсуе.

**Модра ЯНСАНЕ:**

— Зараз нагрузка на настаўніка складае 21 гадзіну. Плюс педагогу аплачваецца класнае кіраўніцтва, падрыхтоўка да ўрокаў, кансультаванне вучняў, праверка сшыткаў. Але праз год-паўтара мы пяройдзем на іншую сістэму аплату працы. Якая гэта будзе сістэма? Пытанне яшчэ абмяркоўваецца. Спадзяёмся, што меркаванне прафсаюза таксама будзе ўлічвацца.

З недаборам на педагагічныя спецыяльнасці мы пакуль не сутыкнуліся, але школа не з'яўляецца прыцягальным для моладзі месцам у плане працаўладкавання. Сёння прыблізна 40 працэнтаў і нават больш школьных настаўнікаў маюць узрост за 50 гадоў. А маладыя настаўнікі атрымліваюць заробак прыблізна 400 еўра.

У папярэднім навучальным годзе ў пачатковай школе працаваў усяго адзін педагог-мужчына. У асноўнай школе колькасць педагогаў-мужчын вагаецца ў межах 3-4 працэнтаў, а ў старшай школе (10—12-ы класы) мужчынскае прадстаўніцтва павялічваецца да 8%. Але ўсё роўна для мужчын педагогіка — не прыцягальная...

Правы выхаду на датэрміновую пенсію латвійскія педагогі страцілі яшчэ ў 1995 годзе, калі скончылася дзеянне папярэдняга дакумента. Сёння ўзрост выхаду на пенсію складае 62 гады. Прафсаюз змагаецца за тое, каб вярнуць права выхаду на датэрміновую пенсію хоць бы некаторым катэгорыям педагогаў — напрыклад, настаўнікам фізічнай культуры і педагогам спецыяльнай адукацыі.

**Расма МОЗЭРЭ:**

— У Латвійскім універсітэце сёлета цалкам укамплектаваны першы курс. Але дэмаграфічная сітуацыя ў краіне такая, што ў наступным годзе, мяркую, у нас будуць сур'ёзныя праблемы з прыцягненнем абітурыентаў. Наконт матывацыі маладых людзей на карысць педагогікі скажу так: найлепшыя агітатары — гэта школьныя педагогі, той прыклад, які ў дзяцей штодня перад вачамі. Павага да сапраўднага педагога, упэўнена, ніколі не знікне...

**Інара РАДЧАНКА:**

— У латвійскіх школах перайшлі на электронны дакументаабарот (электронныя журналы і дзённікі), пасля чаго знікла неабходнасць запаўняць вельмі шмат папер. Гэта вельмі зручна: калі мне трэба ўнесці нейкія карэкціроўкі, я ўсё раблю аператыўна ў электронным фармаце. З бацькамі, вучнямі, адміністрацыяй школы стасункі таксама ажыццяўляюцца з дапамогай электроннай пошты. Але пасля пераходу на электронную дакументацыю мы сутыкнуліся з наступнай праблемай: напрыклад, завуч ці вучань адпраўляюць мне электронны ліст у 8 гадзін вечара і спадзяюцца, што я яго абавязкова прачытаю. І тут спатрэбілася ўмяшанне прафсаюза. Мы ў сваёй школе ўстанавілі, што лісты, якія адпраўляюцца да 16.00, павінны быць прачытаны ў той жа дзень, а калі ліст быў адпраўлены пасля 16.00, яго адпраўнік павінен быць гатовы да таго, што ліст будзе прачытаны настаўнікам толькі на наступны дзень.

### Быць членам прафсаюза выгадна...

**Яніс КРАСЦІНЬШ:**

— З 1 верасня 2014 года ўрад пагаджаецца павялічыць мінімальную стаўку педагогаў, якая сёння складае 280 латаў, на 15 латаў. Мы ж настойваем на іншай лічбе: мінімальны заробак павінен складаць 310 латаў. У наступным годзе ў Латвіі пройдуць парламенцкія выбары — будзем весці перамовы з кандыдатамі ў дэпутаты. Гэта той час, калі да нас усе прыслухоўваюцца.

**«Лісты, якія адпраўляюцца настаўніку па электроннай пошце да 16.00, павінны быць прачытаны ў той жа дзень, а калі ліст быў адпраўлены пасля 16.00, то ён можа быць прачытаны настаўнікам толькі на наступны дзень».**

Пікеты, акцыі ў падтрымку прафсаюзных ініцыятыў для нас будзённая справа. У прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі створаны забастовачны фонд. За 20 гадоў адлічэнняў у фонд пэўнай часткі членскіх узносаў (а гэта былі ўсяго 3 сантымы ў месяц) мы сабралі паўмільёна латаў.

У прыстойнай кампаніі чалавека заўсёды сустракаюць па адзенні. Так і з намі: калі ў цябе ёсць такая страхоўка, ты заўсёды адчуваеш сябе больш упэўненым, нават калі чагосьці просіш ці патрабуеш ад улад.

Таксама ў прафсаюзе створаны фонд страхавання педагогаў ад няшчасных выпадкаў — упэўнены, што гэты досвед і беларусам будзе цікавы. Кожнага педагога мы страхуем на 2 тысячы латаў. І амаль кожны год у нас рэгіструецца да 900 няшчасных выпадкаў, па якіх мы ажыццяўляем страхавыя выплаты. Ці варта казаць, што, у адрозненне ад страхавых кампаній, якія могуць прычапіцца да любой коскі ці любой фармулёўкі ў дагаворы, мы заўсёды ідзём насустрач членам нашага прафсаюза.

**Інара РАДЧАНКА:**

— А яшчэ ў нас дзейнічаюць карткі членаў прафсаюза, якімі можна скарыстацца, каб атрымаць зніжкі на нейкія тавары або паслугі. Прафсаюз заключае дагаворы як з прыватнікамі, так і з дзяржаўнымі ўстановамі (гэта могуць быць паліклінікі, тэатры, цырульні і г.д.) аб прадастаўленні зніжак на 5—10 працэнтаў уладальнікам такіх картак. Інфармацыя аб гэтых арганізацыях пастаянна актуалізуецца на вэб-сайце прафсаюза і накіроўваецца ў пярвічныя арганізацыі. Натуральна, што найбольшая колькасць арганізацый, дзе педагогі могуць атрымаць зніжкі, размешчана ў Рызе. Але ёсць такія магчымасці і ў іншых гарадах. Таму нагода прыгадаць, што педагог з'яўляецца членам галіновага прафсаюза, выпадае даволі часта...

**Расма МОЗЭРЭ:**

— Студэнты не ўваходзяць у прафсаюз работнікаў адукацыі і навукі. Ва ўніверсітэтах дзейнічае моцнае студэнцкае самакіраванне, якое мае вялікія паўнамоцтвы. Але калі ўзнікае патрэба, прафсаюз аб'ядноўвае свае сілы са студэнцкім самакіраваннем. Напрыклад, фінансаванне з бюджэту аднаго студэнцкага месца хвалюе не толькі выкладчыкаў, але і студэнтаў. І ў гэтым пытанні нашы інтарэсы цалкам супадаюць...

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Тэатральнае паляванне



# ДОЎГАЕ ЖЫЦЦЁ

**Да нас прыязджаў Новы рыжскі тэатр, створаны рэжысёрам, які ўжо вядомы ва ўсім свеце як адкрывальнік зусім новай тэатральнай сістэмы. Простым гледачам да сістэм, мабыць, справы няма. Спецыялісты ж спрабуюць знайсці падыходзячыя словы і азначэнні.**

На працягу кастрычніка Мінск захапіла тэатральная ліхаманка дзякуючы фестывалю «ТэАрт». Спектакль рыжан «Доўгае жыццё» заняў асаблівую нішу. Ён просты па змесце і высокамастацкі па выкананні. Аб ім можна спрачацца, але ён чапляе за жывое абсалютна ўсіх.

На спектакль трэба прайсці па доўгім калідоры камунальнай кватэры. Гэтая застаўленая патрэбнымі і непатрэбнымі рэчамі кватэра добра вядомая жыхарам старых дамоў. Выцягнутая ў даўжыню сцяна падзелена на пяць памяшканняў: тры жылыя пакоі, кухня і ванная з прыбіральняй. Без перагародак. Толькі захламленая рэчамі прастора, дзе дажываюць свой век старыя людзі. Трагічны звычайны дзень з жыцця пажылых людзей, якіх напаткалі адзінота і галеча, але не знікла жаданне радавацца любому (хоць і малому) падарунку лёсу.

У спектаклі няма адчування паветра, няма мінулага і будучага часу. Камунальная кватэра мінулага стагоддзя забіта сапраўднай (не бутафорскай) мэбляй, самаробнымі ўпрыгажэннямі сцен і шаф, посудам, шкляначкамі, вымытымі поліэтыленавымі пакетамі, прыгожымі бутэлечкамі, пачачкамі з-пад пячэння — усім тым хламам, з якога справядліва іранізуюць маладыя, якім такая эканомія не зразумелая. Усе гэтыя рысы быту савецкай эпохі для жыхароў камуналкі ніколі не памяняюцца на новае. Іх уладальнікі сыдуць адсюль толькі на могілкі, а дарагія іх сэрцу рэчы будуць выкінуты на сметніцу.

Сапраўдныя рэчы збіралі па знаёмых і на блышыных рынках, каб з дакладнасцю ў дэталях перадаць характар сацыяльнага асяроддзя і звычкі людзей, па якіх можна вызначыць погляды, хваробы, прафесію. Адбываецца дакументальнае даследаванне прыватнага жыцця. Дакументамі з'яўляюцца прадметы быту. Іх сотні. Людзей усяго пяцёра. Дзве сямейныя пары і адзін халасцяк.

У спектаклі няма тэксту. Гісторыю прыдумвалі калектыўна. Можна сказаць, што п'еса пішацца ўсімі, але пераказаць яе нельга, як нельга паставіць яе ў іншым тэатры або з іншымі выканаўцамі. У гэтым галоўная «фішка« сістэмы Херманіса. Яго невялікі склад выканаўцаў — залаты запас, які ўмее спалучаць натуралізм, гратэск, самаіронію.

Праблема старасці не вельмі актыўна абмяркоўваецца ў грамадстве. У ёй ёсць безнадзейнасць. Ёсць раздражненне, часам злосць. Фізіялогію згасання жыцця стараюцца ўтойваць або хаваць за іроніяй. Людзі, асуджаныя на дажыванне, атрымліваюць вельмі мала сапраўднага разумення іх праблем. Старыя з рыжскага спектакля разлічваюць толькі на свае сілы. Смешна, лірычна, паўсядзённа, звыкла жывуць героі латышскіх акцёраў. І так дзіўна, што, калі скончыўся звыклы дзень, пагасла святло і на фінал выйшлі выканаўцы, аказалася: ігралі ўсё гэта маладыя акцёры. Яны размаўлялі з намі з душ і целаў тых, каго ўжо, напэўна, даўно няма. Магчыма, ад сваіх бабуль і дзядуляў. Новае пакаленне захацела адчуць і зразумець духоўны свет старых, мінулае савецкай краіны, старэчае мармытанне і гаворку ўслых з самім сабой, абавязковы вячэрні прагляд навін па тэлевізары і мноства іншых прыкмет сышоўшай эпохі. І гэта ім удалося.

Скрыпучымі тонкімі галасамі заспяваюць яны па-латышску: «Мой касцёр у тумане свеціць...»

У глядацкай зале любой краіны былога СССР хтосьці абавязкова іх падтрымае.

**Таццяна АРЛОВА**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
### о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания жилых домов в д. Заславки, д. Несино Лепельского района Витебской области
## Организатор: Бобровский сельский исполнительный комитет

| Лот | Месторасположение земельного участка, его площадь и кадастровый номер | Целевое назначение земельного участка | Условия и ограничения, инженерно-геологические условия | Расходы по подготовке и изготовлению документации | Начальная цена, рублей | Сумма залога, рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | **д. Заславки, площадь 0,2165, кадастровый номер 222782504701000035** | Для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | 2. Водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос (озеро Урода)<br>6. Охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В | 3045644 | 3000000 | 300000 |
| 2. | **д. Несино, площадь 0,2126, кадастровый номер 222782507101000058** | Для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | 2. Водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос (озеро Несино)<br>6. Охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В | 1109297 | 3000000 | 300000 |

** Инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ.*

1. **Аукцион состоится 29 ноября 2013 года в 14.00 по адресу: Витебская обл., Лепельский р/н, аг. Боброво, ул. В. Маргевич, д. 9.**

2. Заявления от граждан Республики Беларусь на участие в торгах принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Витебская обл., Лепельский район, аг. Боброво, ул. В. Маргевич, д. 9. **Последний день приема заявлений 25 ноября 2013 года**.

3. Для участия в аукционе необходимо предоставить копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенную доверенность, а также предъявляется паспорт или иной документ, удостоверяющий личность и копии платежных документов, подтверждающих уплату залога.

Сумма залога перечисляется до подачи заявления на расчетный счет 3641319011010 в ЦБУ № 211 филиала № 214 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Лепель, ул. Гагарина-1, МФО 660, УНП 300039760.

**Получатель – Бобровский сельский исполнительный комитет.**

4. Не допускается начало торгов по начальной цене.

5. Оплата стоимости предмета аукциона, расходов по организации и проведению аукциона, расходов по подготовке и изготовлению документации, расходов на публикацию в средствах массовой информации, подлежащих возмещению победителем, осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами и земельным участком в натуре.

**Контактные телефоны:**
**8 (02132) 2 91 38, 2 91 45; 8(029) 1333102.**

ЕВРОТОРГ ИНВЕСТБАНК

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2013 г.

ОАО «Евроторгинвестбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | на 01.10.2013 г. | на 01.10.2012 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 10 432,8 | 1 728,7 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | | |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 2 837,0 | 2 015,5 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 22 771,9 | 37 257,4 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 35 156,2 | 375,9 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 191 507,4 | 41 260,8 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | | |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 8 548,3 | 1 978,2 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | | |
| 12 | Прочие активы | 1111 | | 2 949,2 | 2 500,5 |
| 13 | **ИТОГО активы** | **11** | | **274 202,8** | **87 117,0** |
| 14 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | | - | - |
| 16 | Средства банков | 1202 | | 88 267,3 | 13 167,1 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | | 79 601,6 | 3 834,6 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 28 262,2 | - |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | | |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | | 1 638,4 | 405,9 |
| 21 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 197 769,5 | 17 407,6 |
| 22 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | | 64 924,4 | 64 924,4 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | | 4 169,4 | 1 439,2 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 1 701,5 | 1 483,9 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | | 5 638,0 | 1 861,9 |
| 28 | ВСЕГО капитал | 121 | | 76 433,3 | 69 709,4 |
| 29 | **ИТОГО обязательства и капитал** | **12** | | **274 202,8** | **87 117,0** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 октября 2013 г.

ОАО «Евроторгинвестбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | на 01.10.2013 г. | на 01.10.2012 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 33 833,6 | 4 134,4 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 16 162,8 | 477,3 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 17 670,8 | 3 657,1 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 13 185,0 | 8 648,8 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 466,8 | 396,3 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 12 718,2 | 8 252,5 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | | |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 5,4 | |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 3 702,2 | 490,1 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | | |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 2 676,6 | 993,1 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 741,0 | 639,8 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 24 722,5 | 10 099,1 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 1 766,7 | 744,4 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 5 671,8 | 1 202,9 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | | 979,0 | 286,2 |
| 17 | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | | **4 692,8** | **916,7** |

**Председатель Правления** **В.В. Доронкевич**

**Главный бухгалтер** **С.С. Ящук**

**Дата подписания 21 октября 2013 г.**

Более подробную информацию о финансовом состоянии банка можно узнать на сайте **www.eurotorginvestbank.by**

Лицензия ОАО «Евроторгинвестбанк» № 26 от 21.01.2013 г. УНП 807000043.

## Извещение о проведении аукциона
### 27 ноября 2013 года по продаже в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома
## в Лыщицком сельском Совете Брестского района

| № п/п | Местоположение земельного участка | Площадь, га | Начальная (стартовая) стоимость земельного участка, руб. | Целевое назначение земельного участка и его кадастровый номер |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Брестская область, Брестский район, д. Новые Лыщицы, ул. Каштановая, 4** | 0,1720 | 6 078 824 | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома 121282004601000471 |
| | сумма задатка | | 607 900 | |
| | расходы на изготовление земельно-кадастровой документации, руб. | | 3 739 150 | |
| | расходы на объявление в средствах массовой информации, руб. | | согласно акту выполненных работ | |

Земельный участок сформирован на землях д. Новые Лыщицы Лыщицкого сельсовета Брестского района в квартале индивидуальной жилой застройки по ул. Каштановой, 4.

Земельный участок расположен в 20 км от черты г. Бреста.

В населенном пункте Новые Лыщицы по месту нахождения земельного участка имеется железнодорожная станция.

Ограничений в использовании земельного участка не установлено.

Подъезд к земельному участку будет осуществляться по проектируемой ул. Каштановой.

Плодородный слой почвы необходимо снять из-под пятна застройки и использовать для благоустройства данного участка.

**Аукцион будет проводиться 27.11.2013 г. в 10.00 по адресу: Брестский район, д. Новые Лыщицы, ул. Юбилейная, д. 6а (здание сельисполкома). Для проведения аукциона необходимо наличие не менее двух участников.**

Для участия в аукционе необходимо подать заявление об участии в аукционе, копии платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Лыщицкого сельисполкома № 3641 0000 00233 в филиале № 100 Брестского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код 150501246, УНП 200036604, назначение платежа 04901 в виде залога в размере 10% от начальной цены земельного участка, документ (паспорт, вид на жительство иностранного гражданина), подтверждающий личность покупателя.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: Брестский район, д. Новые Лыщицы, ул. Юбилейная, д. 6а (здание сельисполкома) с 8.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявлений — 20 ноября 2013 года.**

**Контактные телефоны: 95 31 50, 95 31 55, 95 31 53, 95 31 56, 95 31 57.**

УНН 600052664

**ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

## ОАО «МинскСортСемОвощ» (223017, Минский район, а/г Гатово)

**по решению наблюдательного совета Общества**
**СОСТОИТСЯ В ОЧНОЙ ФОРМЕ 05 ноября 2013 года.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. О приобретении открытым акционерным обществом «МинскСортСемОвощ» акций открытого акционерного общества «МинскСортСемОвощ».

Место проведения собрания: **г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 1 (актовый зал).**

Начало собрания: **09 часов 00 минут.**

Время регистрации участников — **в день проведения собрания с 8 часов 30 мин. до 8 часов 55 мин. по месту проведения собрания.**

Время ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания — **с 9 до 16 часов в рабочие дни (понедельник—пятница), начиная с 28 октября 2013 года, по адресу: г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 1.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра **на 28 октября 2013 года.**

Регистрация акционеров проводится по паспорту, а представителей акционеров — по паспорту и доверенности.

*Наблюдательный совет ОАО «МинскСортСемОвощ»*

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

### ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Трест Белтрансстрой» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже следующего имущества:

**ЛОТ № 1: ИЗОЛИРОВАННОЕ ПОМЕЩЕНИЕ АДМИНИСТРАТИВНОГО НАЗНАЧЕНИЯ**, инвентарный номер 100/D-64620, об. пл. 447,2 кв.м, расположенное по адресу: **Республика Беларусь, Брестская область, г. Брест, ул. Менжинского, д. 30,** в т.ч. компьютерная сеть, теплосчетчик ТЭМ-05м-1 ДУ 32; теплосчетчик ТС-05.
**Начальная цена с НДС – 3 797 695 477 бел. руб.** Сведения о земельном участке: 177/1000 доли в праве постоянного пользования на земельный участок, пл. 0,0514 га предоставленного для обслуживания жилого дома.

**ЛОТ № 2: ПРОИЗВОДСТВЕННАЯ БАЗА**, расположенная по адресу: **Республика Беларусь, Брестская область, г. Брест, ул. Карасева, 100,** в составе: растворный узел, об. пл. 498,7 кв.м; котельная 488 кв.м (в т.ч. оборудование котельной согласно Перечня); бытовые помещения на 90 человек, об.пл. 410,7 кв.м; механическая мастерская, об. пл. 968,5 кв.м; склад сухих лесоматериалов, об. пл. 501,7 кв.м; гараж автоколонны, об. пл. 798,2 кв.м; навес к складу, об. пл. 430 кв.м; пристройка к пилораме, об. пл. 348,3 кв.м; материальный склад № 1, об. пл. 315,9 кв.м; проходная будка, об. пл. 15,7 кв.м; паровая лесосушилка, об. пл. 71,5 кв.м; склад сыпучих материалов, об. пл. 126,3 кв.м; механический склад цемента, об. пл. 45,2 кв.м; здание КНС, об. пл. 46,1 кв.м; материальный склад № 2, об. пл. 368,1 кв.м; здание компрессорной станции, об. пл. 62,4 кв.м; здание для хранения материалов (кладовки), об. пл. 200 кв.м; навес для кислородных баллонов, об. пл. 28,1 кв.м; повышенный путь; бетонный полигон; хранилище для битума; помещение хозяйственного назначения, об. пл. 34 кв.м; в т.ч. тепловые сети, наружный водопровод, мачты освещения метал. 2 шт.; мачты освещения метал. 5 шт.; линия электропередач 240 мп; канализация.
**Начальная цена с НДС – 14 145 294 827 бел. руб.** Площадь земельного участка для обслуживания производственной базы – **3,6287 га** (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования). Для обслуживания повышенного пути, продавцу на праве постоянного пользования предоставлен земельный участок 0,6699 га. Обременение: частичная аренда.

**Задаток 5% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».**
Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.
*Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 10.09.2013.*
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**
Аукцион состоится **18.11.2013 г. в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Советская, 8. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **15.11.2013 г. до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703.

**Тел.: +375 17 280 36 37; 8029 183 69 71.**

**Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» сообщает,**
***что в соответствии с решением Наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк», на основании предложения Правления ОАО «Белагропромбанк» 29 октября 2013 года***
**ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ.**

Место нахождения общества, место и время проведения собрания: 220036, г. Минск, проспект Жукова, 3, 15.00.

**Повестка дня**

1. О внесении изменений в решение Общего собрания акционеров ОАО «Белагропромбанк» от 30.09.2013, протокол № 9.

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 21 октября 2013 года.

С материалами по вопросам повестки дня лица, имеющие право на участие в Общем собрании акционеров, могут знакомиться по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк» (г. Минск, проспект Жукова, 3) с 22 по 25 октября 2013 г. ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, с 8.30 до 12.30.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы, отделения по месту нахождения акционеров, а также иметь при себе документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров – дополнительно документ, подтверждающий полномочия).

Заполненные бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 27 октября 2013 года по адресу: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, депозитарий ценных бумаг ОАО «Белагропромбанк» почтовой связью, нарочным по месту нахождения Правления банка, филиалов (отделений) по месту нахождения лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, средствами факсимильной связи по телефону/факсу: 229 64 59 или 229 64 51 с обязательной последующей доставкой (досылкой) оригинала бюллетеня.

Принявшими участие в Общем собрании акционеров считаются лица, заполненные бюллетени которых получены ОАО «Белагропромбанк» в установленном порядке.

**Телефон для справок: 8(017) 229 64 59.**

**Телефон Контакт-центра Банка – 136**
8.00-20.00 – рабочие дни, 8.00-18.00 – выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

**www.belapb.by**
Лицензия на осуществление банковской деятельности от 14.06.2013 № 2 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

**В суд Ганцевичского района Брестской области** поступило заявление о признании безвестно отсутствующим СТАБУЛЕВИЧА Сергея Ивановича, 24 марта 1985 года рождения, уроженца г. Ганцевичи Брестской области, последнее место жительства: г. Ганцевичи, ул. Октябрьская, д. 5, кв. 39, Брестской области.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о Стабулевиче Сергее Ивановиче, сообщить их суду Ганцевичского района по адресу: 225432, г. Ганцевичи, ул. Коммунистическая, д. 21, в течение двух месяцев со дня опубликования объявления.

Утерянный бланк строгой отчетности, квитанция форма 1-СУ серия КС № 3295357 **считать недействительным.**
УНП 100985903

**Уважаемые акционеры ОАО «Торгразвитие»!**

Приглашаем Вас принять участие во внеочередном Общем собрании акционеров ОАО «Торгразвитие», которое состоится 14 ноября 2013 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Вильямса, 45, каб. № 23.
Начало регистрации участников собрания с 11.00 до 11.30.

**Повестка дня:**

**1.** Приобретение обществом акций собственной эмиссии по решению самого общества.

**2.** Утвердить положение об аффинированных лицах общества, регламент работы с реестром акционеров общества.

УНП 100041437 *Наблюдательный совет.*

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **Лот № 1. Автомобиль МАЗ 5551А2 320, 2008 г.в., г/н АВ4998-2 стоимостью 137 386 268 белорусских рублей.**<br>**Лот № 2. Полуприцеп МАЗ 998500, 2008 г.в., г/н А0680А-2 стоимостью 132 139 332 белорусских рубля.**<br>**Лот № 3. Автомобиль МАЗ 5432 А5, 2008 г.в., г/н АВ4579-2 стоимостью 181 442 417 белорусских рублей.**<br>**Лот № 4. Автомобиль ГАЗ 32213, 2007 г.в., г/н АЕ5758-2 стоимостью 43 586 704 белорусских рубля** |
| **Собственник (владелец) имущества** | **ДКУСП «Полоцкая ПМК-59» (УНП 300075017)** |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | **г. Полоцк, ул. Криничная, 4** |
| **Наличие обременений** | **Залог ОАО «Белагропромбанк»** |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | **21.11.2013 в 11.30, г. Витебск, ул. Правды, 32, каб. 320** |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Хозяйственный суд Витебской области<br>210101, г. Витебск, ул. Правды, д. 32, каб. 320, http://court.by/vitebsk/<br>Судебный исполнитель Ильющенков Алексей Александрович, тел./факс: (80212) 491349, (8-029) 6635324, старший судебный исполнитель Зуев Михаил Евгеньевич, тел: (80212)491340 (8044)7349300 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903002094 в 200 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 635, УНН 300007670, не позднее 10.00 21.11.2013 г.<br>Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества.<br>Более подробную информацию можно получить на сайте ВХС http://court.gov.by/online-help/executive/disposition/upcoming-auction/Vitebsk/ |

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **Лот № 1. Капитальное строение – одноэтажное панельное здание склада, инв. №252/С-2625, общей площадью 170,1 м.кв., стоимостью 39 396 000 бел. рублей.**<br>**Лот № 2. Капитальное строение – одноэтажное панельное здание пилорамы, с инв. № 252/С-2624, общей площадью 234,9 м.кв., стоимостью 58 140 000 бел. рублей.**<br>**Лот № 3. Капитальное строение – одноэтажное кирпичное здание конторы СМУ, с инв. № 252/С-2606, общей площадью 60,7 м.кв., стоимостью 21 732 000 бел. рублей.**<br>**Лот № 4. Капитальное строение – одноэтажное кирпичное здание РБУ СМУ, с инв. №252/С-2602, общей площадью 309,9 м.кв., стоимостью 93 122 000 бел. рублей.**<br>**Лот № 5. Капитальное строение – одноэтажное кирпичное здание склада, с инв. № 252/С-2595, общей площадью 321,8 м.кв., стоимостью 69 569 000 бел. рублей.** |
| **Собственник (владелец) имущества** | **ООО ПКФ «Натэк» (УНП 390184654)** |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | **г. Новополоцк, г.п. Боровуха, база ООО НКФ «Натэк»** |
| **Наличие обременений** | **Залог ОАО «БПС-Сбербанк»** |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | **26.11.2013 в 11.30, г. Витебск, ул. Правды, 32, каб. 320** |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Хозяйственный суд Витебской области<br>210101, г. Витебск, ул. Правды, д. 32, каб. 320, http://court.by/vitebsk/<br>Судебный исполнитель Ильющенков Алексей Александрович, тел./факс: (80212) 491349, (8-029) 6635324, старший судебный исполнитель Зуев Михаил Евгеньевич, тел.: (80212)491340, (8044)7349300 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903002094 в 200 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 635, УНН 300007670, не позднее 10.00 26.11.2013 г.<br>Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества.<br>Более подробную информацию можно получить на сайте ВХС http://court.gov.by/online-help/executive/disposition/upcoming-auction/Vitebsk/ |

# «ПАТЭЛЕФАНУЙЦЕ Ў СВОЙ БАНК — СЭКАНОМІЦЕ ЧАС...»

## Не забывайце пра дагавор

«Кожны, хто вырашыў аформіць банкаўскую аплатную картку, падпісвае з банкам дагавор, а таксама знаёміцца з правіламі карыстання карткай і ўзнагародамі, што спаганяюцца пры яе выкарыстанні. Менавіта ў адпаведнасці з гэтымі важнымі дакументамі ажыццяўляецца абслугоўванне банкам трымальніка аплатнай карткі», — перш-наперш заяўляе спецыяліст. У дагаворы і правілах падрабязна апісаны ўсе найважнейшыя аспекты, неабходныя для паспяховай і доўгатэрміновай службы карткі: парадак яе выкарыстання, дзеянні ў выпадку яе страты, адрас, рэквізіты і кантактны тэлефон установы банка, у якім адкрыты рахунак, апісана і тое, як карыстацца ПІН-кодам і іншае. Інфармацыя пра ўзнагароджанні, якія спаганяюцца банкам пры абслугоўванні карткі, змяшчаецца альбо ў асобным пункце дагавора, альбо прыкладваецца да дагавора (у залежнасці ад банка).

**Работнікі банка адкажуць на любыя пытанні, звязаныя з выкарыстаннем, афармленнем і абслугоўваннем аплатнай карткі і парадкам ужывання адпаведнай паслугі.**

«Папулярная фраза «Чытайце дагавор» знаёмая ўсім і паспела парадкам надакучыць. Тым не менш, ведаючы простую ісціну, многія не чытаюць гэты дакумент і дадатку да яго, але, падпісваючы, пацвярджаюць, што азнаёміліся і згодны з кожным пунктам. Большасць проста адкладвае дагавор у далёкую скрыню і забывае, а то і зусім губляе, не лічачы гэты дакумент абавязковым, хоць у ім замацаваны абавязкі і правы не толькі банка, але і вызначаны правілы для кліента, — папярэджвае Алена Лагуніна. — Калі ўзнікаюць якія-небудзь пытанні пры выкарыстанні карткі, мы не заўсёды ўспамінаем аб дагаворы і не ведаем, што рабіць. А ўсяго толькі неабходна звярнуцца па тлумачэнні ў філіял банка, з якім заключаны дагавор. Менавіта гэтая ўстанова павінна адказваць на любыя пытанні свайго кліента і вырашаць іх — у тым ліку тыя, якія тычацца змены ўмоў абслугоўвання, абнаўлення карткі і іншага». Бывае, што трымальніка карткі здзіўляе спісанне з рахунку незразумелых, на першы погляд, камісій. А прычына таго, што спаганяемая банкам плата выклікае чыёсьці здзіўленне — няўважлівае прачытанне аднаго з асноўных пунктаў дамовы, які тычыцца ўзнагарод і плат па аперацыях з карткамі і парадкам іх разліку. «Напрыклад, з трымальнікаў картак Беларусбанка спаганяецца камісія за зняцце наяўных грашовых сродкаў у банкаматах і ўстановах іншых банкаў, перавыпуск карткі пры яе страце і іншае. У той жа час бясплатным з'яўляецца правядзенне большасці безнаяўных аперацый, атрыманне наяўных грашовых сродкаў у банкаматах і ўстановах банка, а таксама банкаматах Белінвестбанка, БПБ—Ашчадбанка, Белаграпрамбанка», — адзначае спецыяліст. Дарэчы, час ад часу тарыфы могуць змяняцца, прычым і ў меншы бок. Так што рэкамендуецца перыядычна знаёміцца з імі на сайце або ва ўстановах свайго банка. Банк, у сваю чаргу, загадзя папярэджвае кліентаў пра змены тарыфаў, размяшчаючы інфармацыю ў агульнарэспубліканскіх газетах альбо на ўласных інфармацыйных рэсурсах. «У любым выпадку, калі нешта не зразумела альбо згублены дагавор, штосьці забыліся ці ёсць якія-небудзь сумневы, не трэба праводзіць апытанні знаёмых і сваякоў. Проста патэлефануйце ў свой банк — сэканоміце час. Работнікі банка адкажуць на любыя пытанні, звязаныя з выкарыстаннем, афармленнем і абслугоўваннем аплатнай карткі і парадкам выкарыстання адпаведнай паслугі. Дарэчы, картка — аптымальны інструмент для кантролю сваіх выдаткаў. Можна ў любы момант узяць у банку выпіску па рахунку, дзе адлюстравана кожная праведзеная карткай аперацыя, яе дата і месца правядзення, а таксама сумы банкаўскіх камісій. Такую выпіску можна штомесяц атрымліваць і па электроннай пошце», — кажа Алена Лагуніна.

*Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.*

## Картка з авердрафтам

«Трымальнікам картак, на рахунак якіх ажыццяўляецца пастаяннае паступленне грашовых сродкаў (напрыклад, залічэнне заработнай платы), банкам можа прадастаўляцца кароткатэрміновы крэдыт, так званы авердрафт, — тлумачыць спецыяліст. — Ён дазваляе ажыццяўляць плацяжы пры недахопе або адсутнасці грашовых сродкаў на рахунку, да якога аформлена картка. Пры гэтым трымальнік карткі сам вызначае, калі і ў якой суме выкарыстоўваць такі крэдыт. Працэнты налічваюцца толькі за фактычна выкарыстаную суму авердрафту. Гэта значыць, калі кліент банка аформіў авердрафт, але не выкарыстоўвае яго, працэнты спаганяцца не будуць. Пагашэнне авердрафту і налічаных працэнтаў адбываецца пры залічэнні на рахунак даходаў. Пагашаная сума авердрафту можа быць зноў выкарыстана. Банкамі прапануюцца розныя ўмовы выкарыстання авердрафту, таксама як і тэрміны яго прадастаўлення і пагашэння. Гэтыя дэталі пазначаны ў дагаворы, што заключаецца паміж трымальнікам карткі і банкам пры афармленні авердрафту».

❒❒❒

***Чакаем вашых пытанняў пра карыстанне грашыма і ўсё, што з гэтым звязана. Вы можаце звяртацца на электронны адрас газеты info@zvyazda.minsk.by з пазнакай «для аддзела эканомікі» ці па тэлефоне 8 017 292 38 02.***

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

■ Ключы ад інтэрната

# СТУДЭНТАМ «ДАДУЦЬ» СВЯТЛО?

**На днях некаторыя студэнты БДУ павінны былі пераехаць у новы інтэрнат № 4, які знаходзіцца на тэрыторыі так званай Студэнцкай вёскі. Але наваселле чарговы раз адмянілі. Пайшла пагалоска, нібыта ў будынку па вуліцы Чурлёніса здарылася аварыя, затоплена некалькі паверхаў...**

Каб удакладніць інфармацыю, карэспандэнт «Звязды» патэлефанавала на эканамічны факультэт БДУ. Навучэнцы гэтага факультэта павінны былі стаць аднымі з насельнікаў інтэрната №4.

— Нашы студэнты зараз не на вуліцы, яны спакойна жывуць у іншых інтэрнатах. А засяленне ў «чацвёрку» планавалася, але пастаянна адкладвалася. Спачатку абяцалі, што гэта адбудзецца ў верасні, пасля тэрмін перанеслі на кастрычнік, — паведаміў **намеснік дэкана па вучэбна-выхаваўчай рабоце эканамічнага факультэта БДУ Аляксандр ВАРАБ'ЁЎ**.

Па яго словах, у гэтым месяцы верагоднай датай засялення называлі спачатку 15-га, а пазней — 21 кастрычніка, але пераезд зноў адмяніўся.

— Прычыну нам не тлумачылі. Тут трэба разумець, што дырэкцыя студгарадка не можа адказваць за будаўнікоў, якія вядуць работы ў інтэрнаце, — адзначыў Аляксандр Вараб'ёў.

Высветліць, чаму адмянілі пераезд у інтэрнат на Чурлёніса, мы паспрабавалі ў **дырэктара студэнцкага гарадка БДУ Міхаіла ЧАРАПЕННІКАВА**:

— Інфармацыя пра некалькі затопленых паверхаў — гэта няпраўда. У інтэрнаце прарвала водаправод, наступствы распаўсюдзіліся ўсяго толькі на па́ру пакояў. Але не гэта стала прычынай часовага пераносу засялення, няспраўнасць даволі хутка ліквідавалі, — адзначыў Міхаіл Чарапеннікаў.

Як расказаў дырэктар Студэнцкага гарадка, запаветныя ключы ад пакояў студэнты ўсё яшчэ не атрымалі па прычыне адсутнасці ў інтэрнаце пастаяннай схемы падключэння электрычнасці. Але гэта — «пытанне да заказчыка і падрадчыка». Як толькі праблема з электрычнасцю будзе вырашана, студэнты змогуць пераехаць у інтэрнат літаральна на наступны дзень.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ**

■




Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Карова. Доля. Пост. Гол. Абак. Конь. Рама. Ажур. Хабар. Пара. Карэя. Ата. Эпігон. Кай. Кава. Рапіра. Стан. Цэх. Туба. Парада. Норма. Каза. Рок. Мята. Тло. Раб. Трагік. Тата. Амар. Сера. Трывога. **Па вертыкалі:** Дакука. Свіння. Норка. Стрыт. Вотум. "Ява". Абарот. Ашуг. Хнаха. Кратар. Дыпламат. Агама. Баба. Арбіта. Лёска. Карт. Карэц. Пак. Капа. Тупік. Рым. Рагавіца. Рой. Рэдут. Збан. Даха. Авечка.

## «Вертыкальныя» старты ў «Аквамарыне»

**Чатырнаццатая па ліку спартакіяда сярод работнікаў выканаўчай і распарадчай улады Брэсцкай вобласці прайшла ў мінулую суботу ў Століне. У гэты дзень адбылося адкрыццё доўгачаканага спартыўнага комплексу ў райцэнтры.**

Як заўважыў падчас адкрыцця комплексу **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін СУМАР,** Століншчына адрозніваецца высокімі дэмаграфічнымі паказчыкамі, тут умеюць і любяць працаваць, а пасля работы чалавек павінен мець магчымасць адпачыць на карысць здароўю. Вось гэтаму і паслужыць «Аквамарын». Тут ёсць два басейны, гульнявыя і трэнажорныя залы, саўна, кавярня. Гадзіна выкарыстання тэніснага корта абыдзецца ў 20 тысяч рублёў, а 90 хвілін у трэнажорнай зале — усяго на дзве тысячы больш.

Спартакіяда стала паспяховым стартам «Аквамарына». Прайшлі спаборніцтвы па міні-футболе і валейболе, спаборнічалі більярдысты, адбыліся заплывы. Прызёраў выбралі сярод шахматыстаў, гульцоў у настольны тэніс, веласіпедыстаў і інш.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## УСМІХНЕМСЯ

**Калі ў жонкі жудасны настрой, адыдзіце на бяспечную адлегласць і кіньце ў яе кашальком.**

Адэса.

— Тата, а што далей — Месяц ці Жытомір?

— Фіма, не дуры мне галаву! Падыдзі да акна. Месяц бачыш?

— Бачу.

— А Жытомір?

**Чай, наогул, сродак універсальны. Запросіш на гарбату мужчыну — будзе секс, запросіш сяброўку — п'янка.**

Жонка, вярнуўшыся з камандзіроўкі, учыняе мужу разнос:

— Ты чаму сюды баб цягаў?

— Ды не цягаў я нікога!

— Дзе я працую?

— Ты мяне за ідыёта лічыш, ці што?! У клінічнай лабараторыі ты працуеш!

— Вось! І кроў з камара, якога я злавіла ў спальні, — не твая!

**Раней тэхнолаг, які ўзважваў на кандытарскай фабрыцы ўсе інгрэдыенты для вырабаў, працаваў у белым халаце і каўпаку. Сёння — у хімахове.**



caricatura.ru

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.53 | 17.54 | 10.01 |
| Віцебск — | 7.45 | 17.41 | 9.56 |
| Магілёў — | 7.43 | 17.45 | 10.02 |
| Гомель — | 7.36 | 17.45 | 10.09 |
| Гродна — | 8.07 | 18.10 | 10.03 |
| Брэст — | 8.04 | 18.14 | 10.10 |

**Месяц**

*Апошняя квадра 27 кастрычніка. Месяц у сузор'і Блізнят.*

**Імяніны**

*Пр. Андрэя, Інакенція.*
*К. Іветы, Марлены, Тэклі, Ігната, Северына, Тодара, Яны.*

# ЗАЎТРА




...у суседзяў

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ВАРШАВА | +16..+18°C | КІЕЎ | +14..+16°C | РЫГА | +13..+15°C |
| ВІЛЬНЮС | +14..+16°C | МАСКВА | +8..+10°C | С.-ПЕЦЯРБУРГ | +10..+12°C |



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Даты Падзеі Людзі

**1501** год — заключаны Мельніцкі акт аб умовах саюза Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага. У сувязі з тым, што па ўмовах гэтага акта ВКЛ губляла частку свайго суверэнітэту, сойм Вялікага Княства ў 1505 годзе не зацвердзіў яго.



**1768** год — Кацярына II праявіла рашучасць, якую, па яе ўласных словах, мог праявіць у Англіі кожны вулічны хлапчук. Спецыяльна выпісаны з той жа Брытаніі доктар Дымсдэйл узяў воспу ад хворага рускага хлопчыка Маркава і прышчапіў яе адукаванай імператрыцы. Хлапчук Аляксандр Маркаў па волі Кацярыны II стаў дваранінам, атрымаў герб і прозвішча Воспенны. З тых часоў Расія ўлілася ў цывілізаваную супольнасць, і больш за дзвесце гадоў кожны чалавек у дзяцінстве атрымліваў воспіны на перадплечча, каб засцерагчыся ад іх на твары. З 1980 года прышчэпак не робяць: Сусветная арганізацыя аховы здароўя абвясціла, што віруса воспы больш у прыродзе не існуе.

**1951** год — нарадзіўся (вёска Сноў Нясвіжскага раёна) Вячаслаў Мікалаевіч Ярмолік — беларускі вучоны ў галіне тэхнічнай кібернетыкі і інфарматыкі, доктар тэхнічных навук, прафесар. Аўтар навуковых прац па праектаванні і тэсціраванні лічбавых прылад ЭВМ і абароне інфармацыі.

Было сказана

**Янка БРЫЛЬ, народны пісьменнік Беларусі:**

*«Ты пачынаешся тады, калі робіш выбар сам».*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара — галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 23.185. Індэкс 63850. Зак. № 4596.

Нумар падпісаны ў 19.30 22 кастрычніка 2013 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12